ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дарожным дакладам „Прафрух")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасля тэксту—50 к., шпальтовыя абвесткі—1 р. за радок. Пасля тэксту — у два разы дарожэй. [illegible] Зьмяш. тэрфу, згодна пагадненьні СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. зьдачку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

Люксембург, Б-ко ВСНХ СССР зыл. студ. сыпок

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

СЕРАДА, 17 верасьня 1930 г.
№ 218 (3816)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

НАСУСТРАЧ КАЛГАСНАМУ ПРЫБОЮ

ЦК УсеКП(б) НАПАМІНАЕ

злучыць сяўбу з арганізацыяй прыліву ў калгасы

Супроць арганізацыі працы, за развал калгасаў з сярэдзіны выступае клясавы вораг

Па кулаку, па яго агентуры—правых апартуністых—руйнуючы ўдар. Па-бальшавіцку правядзем сяўбу

За заўтрашняга калгасьніка

Трэці год пяцігодкі павінен забясьпечыць «пераход ня менш, чым паловы сялянскіх гаспадарак СССР на сацыялістычны шлях, на шлях калектывізацыі» (З адозвы ЦК УсеКП(б). Гэта вялічэзная задача вынікае з бурнага росту індустрыялізацыі, якая зьяўляецца адзінай базай сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Ажыцьцяўленьне гэтай задачы патрабуе вялізарнай напружанасьці і мабілізацыі ўсіх сіл. Толькі вядучы з дня на дзень настойлівае і ўпартае змаганьне за арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў, толькі па-бальшавіцку арганізуючы новы калгасны прыбой і бязьлітасна наступаючы на кулака, мы выканаем гістарычную праграму суцэльнай калектывізацыі адзінаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Змаганьне за далейшае разьвіцьцё калгаснага будаўніцтва, змаганьне за адзінаасобніка — заўтрашняга калгасьніка — аснова асноў усёй работы партыйных арганізацый на вёсцы. Асеньняя сяўба павінна стаць выходным пунктам у гэтай барацьбе. Менавіта восеньню, калі калгасы, маючы за сабой вопыт па-бальшавіцку праведзенай веснавой сяўбы, падагульваюць вынікі калектыўнай працы, і адзінаасобнік на фантах самога жыцьця пераконваецца ў перавагах калектыўнай гаспадаркі, — трэба дабіцца новага магутнага ўздыму суцэльнай калектывізацыі.

Ці ўсё робіцца на мясцох у гэтым напрамку. Ці пераключыліся ўсе мясцовыя партыйныя арганізацыі на змаганьне за ўмацаваньне і разьвіцьцё калгасаў, за баявое правядзеньне асеньняй сяўбы, за новы калгасны прыпіў. Не, далёка ня ўсе. Факты з месц сыгналізуюць, што ў пэўнай частцы раёнаў не праводзіцца літаральна ніякай работы па замацаваньні калгасаў, па арганізацыі прыліву бядняцка-серадняцкіх мас у калектывы. Аб чым, як не аб ганебна спадай рабоце па арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў, як не аб правааапартуністычнай бязьдзейнасьці шмат якіх раённых партыйных арганізацый і калгасна-земельных органаў, сьведчыць адставаньне калгасаў у асеньняй сяўбе. Замест баявой сапраўды ўдарнай работы, у радзе месц мы сустракаемся з апартуністычнай пасыўнасьцю, з бюракратычнай расхлябанасьцю, з самацёчнымі дэмабілізацыйнымі настроямі.

У сёнешнім нумары «ЗЬВЯЗДЫ» зьмешчаны цэлы рад карэспандэнцый, якія выразна ілюструюць гэтую думку.

Паслухайце, што паведамляюць нам з Горацкага раёну. Адзінаасобныя бядняцка-серадняцкія масы, пад уплывам посьпехаў перадавых калгасаў, жадаюць уступіць у калектывы. Адзінаасобнікі па ўласнай ініцыятыве ўзьнімаюць пытаньне аб арганізацыі калгасу, просяць раённыя арганізацыі дапамагчы ім у гэтым. Якая іншая база патрэбна для новага ўздыму калгаснага руху, для новага прыпіву бядняцка-серадняцкіх мас, якія на практыцы веснавой сяўбы пераканаліся, што суцэльная калектывізацыя ёсьць адзіны шлях да ліквідацыі кулацтва, як клясы, і да перабудовы сельскай гаспадаркі? Што-ж робяць раённыя арганізацыі? Ці пайшлі яны насустрач актыўнасьці бядняцка-серадняцкіх мас? Не. Партыйна-савецкае кіраўніцтва раёну павярнулася сьпіной да калгаснага прыпіву, яно на радасьць кулакам пальцам не паварушыла, каб дапамагчы калгасам ва ўборцы і асеньняй сяўбе, каб арганізаваць новы прыпіў. Гэтая непьга інакш расцэньваць як адмаўленьне ад калектывізацыі — адзінага мэтаду сацыялістычнай перабудовы вёскі. Горацкія правыя апартуністыя забылі, што «мэтад суцэльнае калектывізацыі зьяўляецца тым неабходным мэтадам, без якога немагчыма выкананьне пяцігадовага пляну калектывізацыі ўсіх вобласьцяй СССР. Ян можна ад яго адмаўляцца, ня здрадзіўшы камунізму, ня здрадзіўшы інтарэсам рабочае клясы і сялянства» (І. Сталін).

А ў цэлым шэрагу месц мы менавіта маем факты праваапартуністычнага самацёку ў калгасным будаўніцтве. Асобныя арганізацыі не даюць адпору кулацтву, прымірэнча адносяцца да выпазак кулацтва, якое прабуе затармазіць пераможны рух калектывізацыі. Прачытайце карэспандэнцыю «Кулак на чале калгасу» і вы ўбачыце перад сабою малюнак простага саюзу правых апартуністых з клясавым ворагам, малюнак поўнай дэмабілізацыі партыйнай ячэйкі і райкому партыі з фронту барацьбы з кулаком. На вачох раённага камітэту партыі, на вачох калгаснае парт'ячэйкі кулацкая агентура разбурае буйную калектыўную гаспадарку. Кулакі разгортваюць сваю агітацыю пра пайкі, клясавы вораг адкрыта разбурае калгас, а Самахвалавіцкі райком партыі нічога «не заўважае», а калгасныя камуністыя ўтойваюць ад калгасьнікаў дырэктывы партыі пра разьмеркаваньне ўраджаю. Хіба гэта ня ёсьць здрада інтарэсам партыі і рабочае клясы, здрада калектывізацыі?

Шырэй разгорнем фронт змаганьня за арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў, за бальшавіцкае правядзеньне асеньняе сяўбы, кінем усе свае сілы на бальшавіцкую арганізацыю новага калгаснага прыпіву!

Калгасы, больш энэргіі, больш сіл, больш напружанае баявое работы па правядзеньні асеньняй сяўбы! Змагайцеся за пасеўныя пляны, за пашырэньне азімага кліну! Выразнай арганізацыяй працы, правільным разьмеркаваньнем ураджаю, працоўнай дапамогай адзінаасобным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам выклікайце новую хвалю калгаснага прыпіву!

Партыйныя арганізацыі, ваша задача, ваш абавязак няўхільна змагацца за ўмацаваньне калгасаў, за правільную арганізацыю працы ў калектыўных гаспадарках. Вы адказваеце перад партыяй, перад рабочай клясай за няўхільны рост калектывізацыі. Па-бальшавіцку з ленінскаю настойлівасьцю і ўпартасьцю арганізуйце калгасны прыпіў. Памятайце, што выкананьне і перавыкананьне пасеўных плянаў у калгасах, правільнае разьмеркаваньне ўраджаю, выразная арганізацыя працы, дапамога адзінаасобніку — самыя асноўныя ўмовы далейшага росту калектывізацыі.

Давайце бязьлітасны адпор кулацтву і яго праваапартуністычнай агентуры. Выкрывайце правых апартуністых, якія прабуюць затармазіць сяўбу, затармазіць калгасны рух. Змагаючыся з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай, мацней беце на «левых» апартуністых, па ўсякіх рэцэдывах антысэрадняцкіх перагібаў.

Недапушчальнае адставаньне калгасаў у асеньняй сяўбе павінна быць зараз-жа ліквідавана.

Трэці год пяцігодкі мы павінны сустрэць масавай арганізацыяй новых калгасаў, перавыкананьнем пасеўных плянаў, найшырэйшым далейшым разгортваньнем суцэльнае калектывізацыі. Усе нашы сілы, усю нашу энэргію, волю і настойлівасьць—на выкананьне гэтае баявое задачы.

Няўхільным змаганьнем за новы калгасны прыпіў забясьпечым далейшае разгортваньне суцэльнае калектывізацыі, ліквідацыі кулацтва, як клясы, на гэтай аснове.

Сьпіной да калгаснага прыліву

У **Горацкім** раёне не праводзіцца ніякай работы па арганізацыі новага калгаснага прыліву. Раённае партыйна-савецкае кіраўніцтва заражана самацёчнымі, праваапартуністычнымі настроямі.

Бядняцка-серадняцкія масы адзінаасобнікаў на ўласнай ініцыятыве ўзьнімаюць пытаньне аб арганізацыі калгасаў, але ці адна раённая арганізацыя ня ідзе насустрач. Прыпіў, які заўважаецца ў асобных калгасах раёну, праходзіць поўным самацёкам.

Між тым, жаданьне адзінаасобнікаў уступіць у калгасы даволі вялікае. Аб гэтым сьведчыць хаця-б наступны факт. У адным з цёсак Кацелеўскага сельсавету адзінаасобнікі--беднякі і сераднякі папрасілі брыгаду ЦК КП(б)Б, якая прыехала туды, дапамагчы ім арганізаваць калгас. Брыгада адразу правяла арганізацыйную і растлумачальную работу. **НА ДГУГІ-Ж ДЗЕНЬ У ВЁСЦЫ АРГАНІЗАВАЎСЯ КАЛГАС.**

Д-А.

Аб парадку прыёму ў партыю

(Пастанова бюро ЦК КП(б)Б ад 16 верасьня)

Згодна пастановы аргбюро ЦК УсеКП(б) ад 6 жніўня г.г. аб уступленьні ў мод прыёму ў партыю асоб першай і другой катэгорыі па зацьвярджэньні райкомаў, або гаркомаў, бюро ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Парадак канчатковага афармленьня прыёму ў партыю асоб усіх 3-х катэгорый устанавіць наступны: бюро і агульны сход сельскай або вытворчай ячэйкі і бюро райкому або гаркому для асоб 1-й і 2-й катэгорый, а для асоб 3-й катэгорыі — сакратарыят ЦК КП(б)Б.

2. Канчатковай інстанцыяй па прыёме ў партыю выхадцаў з іншых партый для ўсіх з 3-й катэгорыі зьяўляецца ЦК КП(б)Б.

3. Прапанаваць райкомам і гаркомам забясьпечыць поўнае афармленьне прыёму ў партыю асоб 1-й і 2-й катэгорый ў 2-дэкадны тэрмін, а асоб 3-й катэгорыі — у месячны тэрмін.

4. Для разгляду прыёму ў партыю асоб 3-й катэгорыі вылучыць пры ЦК КП(б)Б камісію ў складзе т.т. Чарнушэвіча, Кавалёва і Ляўкова.

СЯЎБА ІДЗЕ



2 трактары цягнуць па 6 радовых сявярак

Глушыцелі калгаснай ініцыятывы

Праўленьне калгасу „Іскра" супроць... арганізацыі працы

Калгас **«ІСКРА»** (Глінскі сельсавет, Чэрыкаўскага раёну) аб'ядноае звыш 100 гаспадарак. У калгасе ёсьць усе ўмовы для разьвіцьця буйной калектыўнай гаспадаркі. С.-г. машынамі і цягавай сілай калгас забясьпечаны. Рабочых рук таксама хапае. Адным, становішча «Іскры» **НЕЛЬГА** ні ў якім разе прызнаць здавальняючым.

У калгасе ёсьць цэлы рад сур'ёзных арганізацыйна-гаспадарчых цепаранкаў. Праўленьне калгасу яўна не спраўляецца са сваімі задачамі. Праўленьне нічога ня робіць для таго, каб замацаваць гаспадарчае становішча калгасу, выразна арганізаваць працу і забясьпечыць прыліў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Да сёнешняга дня ў калгасе **НЕ АБАГУЛЕНЫ** цягавая сіла і с.-г., машыны, ня гледзячы на тое, што калгасьнікі яшчэ вясною ўхвалілі статут с.-г. арцелі. Потым калгасьнікі ня раз на сваіх агульных сходах ухвалялі пастановы пра абагуленьне цягавай сілы і с.-г. інвэнтару. Але праўленьне калгасу нічога не зрабіла, каб выканаць гэтыя пастановы. У выніку ў калгасе кожны дзень можна заўважаць наступнае: члены праўленьня і кіраўнікі брыгад ходзяць ад калгасьніка да калгасьніка і просяць іх даць сваіх коняй на ўборку. Такія просьбы працягваюцца да 9—10 гадзін раніцы. На работу-ж калгасьнікі выходзяць значна пазьней. Бывае шмат выпадкаў, калі калгасьнікі на конях едуць у горад ці куды на сваіх асабістых справах. Тады ўборка ўраджаю спыняецца, бо няма цягавай сілы.

Брыгадзіры даюць нарады па работу не папярэдадні працоўнага дня, а ў 7-8 гадз. раніцы. Накуль калгасьнікі атрымалі нарады і паказаньні, марна трацілася рабочы час.

Да гэтага часу ў калгасе няма сталых норм выпрацоўкі. Зьдзелшчына ня ўведзена, існуе падзённшчына. Таму пэўная частка калгасьнікаў выходзіць на работу і ідзе з яе тады, калі захоча. Кіраўнікі брыгад сваіх абавязкаў ня выконваюць. Брыгадзіры абмяжоўваюцца толькі тым, што даюць нарады. Якжа праходзяць палявыя работы — брыгадзіры ня цікавяцца. Ніхто з іх ня бывае на полі.

Калгасьнікі ня раз прасілі праўленьне выпрацаваць нормы працы і ўчасьнорм выпрацоўкі. Зьдзельшчына ня выканала просьбы калгасьнікаў. Калгасьнікі ўзьнімалі пытаньне аб сацыялістычным спаборніцтве і арганізацыі ўдарных брыгад, але ніякага праўленьне не пайшло ім насустрач.

У сьвятле гэтых фактаў зусім ня дзіва, што ўборка яравых у калгасе стаіць на нерозе зрыву. Сенажаць пабіта, значная частка пасеваў знаходзіцца яшчэ на полі. Праўленьне амо зрывае ўборку. Напрыклад, намесьнік старшыні калгасу нядаўна загадаў сьвятковаць рэлігійнае сьвята, у той час, як усе калгасьнікі, як адзін, хацелі пайсьці на ўборку сенажаці.

Пляну асеньняй сяўбы ў калгасе няма. Насенныя фонды ня створаны. Ня прыступлена да ачысткі насеньня. Значная частка зямлі не падрыхтавана пад азімы клін, бо трактары ў калгасе працуюць з далёка ня поўнай нагрузкай. Кожны дзень трактары працуюць ня больш 9, максымум 10 гадзін. Праўленьне калгасу нічога ня робіць, каб нагрузіць трактары. Пастанова НКЗ аб 20-гадзінным рабочым трактару груба парушаецца. Варта адзначыць, што трактарыстыя нядбайна адносяцца да сваёй работы. Якасьць ворыва прымушае жадаць шмат лепшага. Трактарыстыя часта робяць зусім непатрэбныя астаноўкі.

Трэба адзначыць, што праўленьне калгасу груба ігнаруе адзінаасобнікаў. Ня гледзячы на тое, што калгасьнікі хочуць аказаць дапамогу адзінаасобнікам с.-г. машынамі і інш., былі факты, калі праўленьне забараняла даваць калгасныя машыны адзінаасобнікам.

Вывад зусім зразумелы. Праўленьне калгасу «Іскра» павінна быць неадкладна зьменена. Праўленьне, якое глушыць ініцыятыву калгасьнікаў, якое дэзарганізуе гаспадарку, не павінна кіраваць калгасам.

Г—ў.

Засеяна пшаніцы і жыта **8,9 і 12,9%** плянавых заданьняў

СЯЎБА ІДЗЕ СЛАБА

ВЫШЭЙ ТЭМПЫ!

Біць па бюракратах і апартуністых

Зводка аб ходзе сяўбы пшаніцы і жыта на 1-га верасьня адзначае выкананьне пасеўнага пляну калгасамі ў сярэднім па рэспубліцы: пшаніцы — **8,9 процантаў** і жыта — **12,9 проц.**, супроць сяўбы па індывідуальным сэктары ў сярэднім: пшаніцы — **15,2 проц.** і жыта — **22,6 проц.**

Гэтыя лічбы сыгналізуюць аб магчымых больш глыбокіх прарывах на пасеўным фронце. Нічым іншым, як неарганізаванасьцю ў калгасах і бюракратычнай непаваротлівасьцю райкалгасаюзаў і калгасэкцый большасьці раёнаў, нельга вытлумачыць адставаньне калгаснага сэктару ў сяўбе ад індывідуальнага.

Спасыланьні на «аб'ектыўныя» ўмовы: дождж, недахват рабочых рук і г. д. у даным выпадку зьяўляюцца праявамі праваапартуністычнай пасыўнасьці.

Вось раёны, дзе панує гэта пасыўнасьць, у выніку чаго пасеяна жыта: **Бярэзінскі раён — 0 проц.; Каралінскі раён — 0,3 проц.; Магілеўскі раён — 0 проц.; Чавускі раён — 0,9 проц.; Лепельскі раён — 1,2 проц.; Чашніцкі — 1,3 проц.; Рэчыцкі — 1,5 проц.; Хойніцкі — 1,7 проц.; Лупалаўскі — 1,8 проц.; Смалявіцкі — 2 проц.; Старадарожскі — 2,3 проц.** Гэты сьпіс можна працягнуць яшчэ на дзесяткі раёнаў.

Лепш стаіць справа з сяўбой у раёнах: **Чэрыкаўскі — 50 проц., Касьцюковіцкі — 48,8 проц., Мсьціслаўскі—47,6 процантаў, Клімавіцкі — 46 проц., Барысаўскі — 39 проц., Чырвонапольскі —33 проц., Боркавіцкі — 32,1 проц. і Сеньнінскі—30,2 проц.**

Ставячы паказаныя раёны ў прыклад рашчо раёнаў, Белкалгасцэнтр катэгарычна патрабуе ад усіх райкалгасаюзаў і райкалгасэкцый спыніць самацёчныя настрої ў справе адказнейшай кампаніі азімай сяўбы, безадкладна паставіць перад усімі калгасьнікамі задачу разгортваньня сяўбы азімай пшаніцы і жыта ўдарнымі тэмпамі. Зьнімайце з работы працаўнікоў **саюзаў і калгасаў, якія не спраўляюцца з задачай арганізацыі сяўбы.**

Праўленьне Белкалгасцэнтру папярэджвае тыя райкалгасаюзы і райкалгасэкцыі, дзе сяўба азімых ідзе марудна, што калі на працягу бліжэйшых дзён ня будзе пералому ў разгортваньні сяўбы, мы прымушаны будзем ставіць пытаньне аб прыцягненьні **да судовай адказнасьці адпаведных праўленьняў райсаюзаў.**

Адначасова праўленьне Белкалгасцэнтру зварачае ўвагу калгасаюзаў і сэкцый на недапушчальнае зьніжэньне плянавага заданьня пасеўнай плошчы пад азімымі культурамі і прапануе правесьці максымальнае пашырэньне пасеву азімых.

Старшыня Белкалгасцэнтру МІЦЬКОЎ.

ПАСТАНОВА ЦК УсеКП(б)

АБ ХОДЗЕ АСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ

15 верасьня 1930 г.

Асеньняя пасеўная кампанія побач з хлебазагатоўкамі, якія маюць вялізарнае значэньне для росту і ўмацаваньня сацыялістычнага сэктару ў вёсцы, павінна стаць пунктам новага ўздыму суцэльнай калектывізацыі, далейшага ўцягненьня ў калгасы новых мільёнаў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, якія пераканаліся на вопыце мінулага году, што шлях да калектывізацыі—ёсьць адзіны шлях да ліквідацыі кулацтва і як клясы, і разам з тым, шлях сапраўды магутнага ўздыму сельскае гаспадаркі. Асеньняя сяўба павінна быць праведзена бальшавіцкім тэмпам і на правядзеньні яе павінны быць згрупаваны ўвага і намаганьні ўсёй партыі, рабочае клясы, найшырэйшых бядняцка-серадняцкіх мас і ў першую чаргу калгасьнікаў з разгортваньнем пры гэтым яшчэ больш рашучага наступленьня супроць кулацтва. Між тым, на аснове разгорнутай ужо сяўбы, ЦК УсеКП(б) канстатуе:

1. Асеньняя сяўба амаль ва ўсіх раёнах ідзе яўна нездавальняюча (на 10 верасьня ў раёнах, тэрміны сяўбы ў якіх ужо канчаюцца, засеяна ў сярэднім каля 60 проц. пляну), што зьяўляецца выпікам зусім невыстарчальнай увагі да задач асеньняй сяўбы з боку мясцовых партыйных арганізацый, а таксама зямельных, калгасных і каапэрацыйных органаў, якія не змаглі яшчэ мабілізаваць масы на гэта правядзеньне і не зьвязалі сяўбы са справай новага ўздыму калгаснага будаўніцтва.

2. Пры агульнай задаволенасьці сяўбы асабліва недапушчальным зьяўляецца рэзкае адставаньне сяўбы калгасаў (якія выканалі 16 верасьня па тых-жа раёнах каля 35 проц. пляну), што тлумачыцца: а) адсутнасьцю разгорнутай масавай работы па ўцягненьні новых калгасьнікаў, для чаго даны ўсе прадпасылкі пасьпяховым завяршэньнем калектыўнай веснавой сяўбы і калектыўнага збору ўраджаю; б) нездавальняючай арганізацыяй работы ў калгасах і невыстарчальным кіраўніцтвам з боку мясцовых органаў разьмеркаваньнем працы і цягавай сілы ў калгасах паміж дачамі на скончэньні ўборкі, па выкананьні хлебазагатовак і па азімай сяўбе; в) невыстарчальным адпорам рвацкім тэндэнцыям асобных калгасьнікаў, якія процістаўляюць свае вузкія інтарэсы інтарэсам усёй масы калгасьнікаў (падрыў працоўнай дысцыпліны, невыкананьне пастаноў калгасу і г. д.), што па справе падрывае далейшы ўздым калгаснае гаспадаркі і адбівае кулацкі ўплыў на асобных калгасьнікаў.

3. Некаторыя абласныя арганізацыі (ЦЧВ, Заходняя, Іванава-Вазьнясенская і інш.), замест таго, каб мабілізаваць усе сілы на выкананьне зацьверджанага пляну асеньняй сяўбы, робяць самачынны перагляд пляну ў бок яго зьніжэньня, што зьяўляецца простым патураньнем дэмабілізацыйным настроям у правядзеньні асеньняй сяўбы. У сувязі з гэтым ЦК УсеКП(б) прапануе ўсім ЦК нацкампартый, абкомам, крайкомам і райкомам:

а) Дабіцца ў бліжэйшыя дні рашучага пералому ў ходзе асеньняй сяўбы, улічваючы бязумоўную абавязковасьць выкананьня зацьверджанага ЦК і Саўнаркомам пляну азімага пасеву ў 43 млн. гэкт.

б) Зьвязаць на справе асеньнюю пасеўную кампанію з далейшым уцягненьнем індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у існуючыя калгасы, са стварэньнем новых калгасаў, рашуча змагаючыся з анты-бальшавіцкімі тэндэнцыямі адкладваньня справы калектывізацыі на перыд пасьля скапчэньня асеньняй сяўбы.

в) Аказаць шырокае падтрыманьне азімай сяўбе ў саўгасах, асабліва новых, якія ня маюць яшчэ выстарчальнага тэхнічнага ўзбраеньня.

г) Забясьпечыць выкананьне ўстаноўленай праграмы зяблевага ўзорваньня (у 60 млн. гэкт.), як важнейшага элемэнту ў падрыхтоўцы далейшага росту калектывізацыі і масавай калектыўнай сяўбы будучай вясны.

д) Шырока разгарнуць кампанію на сацыялістычным спаборніцтве паміж калгасамі і калгасьнікамі па выкананьні пляну асеньняй сяўбы і зяблевага ўзорваньня.

ЦК УсеКП(б).

Клясавы вораг на чале калгасу

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Арцель **«Кастрычнік»** зьяўляецца адным з буйнейшых калгасаў Менішчыны. Яна займае плошчу ў 4.000 га, з якіх пад прысевам знаходзіцца звыш 2.500 гэктараў. На кожны двор у калгасе прыпадае каля 25 га пасеваў.

«Кастрычнік» арганізаваўся ўнесну гэтага году. Ўзьлом новых калгасьнікаў быў вялікім. «Кастрычнік» першы з усіх калгасаў рэспублікі арганізаваў чырвоны абоз.

Раённае партыйна-савецкае кіраўніцтва, калгасная ячэйка КП(б)Б і кіраўнікі арцелі ня сталі на чале гэтага ўздыму. Яны зусім забылі, што трэба настойліва з дня на дзень змагацца за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасу. Такое асноўнае пытаньне, як арганізацыя працы, зусім выпала з-пад увагі кіраўнікоў калгасу. Работа ішла самацёкам, бяз усякага пляну. У выніку стварылася становішча, якое выклікае сур'ёзную трывогу за лёс арцелі, якое пагражае ёй разьвалам.

З-за злачыннай бязьдзейнасьці кіраўніцтва калгасу, у арцелі няма ніякай арганізацыі працы і працоўная дысцыпліна ганебна расхістана. Уборачная кампанія і асеньняя сяўба зрываюцца. На сёнешні дзень ня ўбрана каля 400 га аўсу. Авёс псуецца, парастае і асыпаецца. Ня ўбрана таксама 200 га сенажаці. 20 га пасеваў ільну яшчэ знаходзяцца на полі. У калгасе не хапае рабочых рук. І ў той-жа час частка калгасьнікаў (20-25 проц.) штодзённа ня выходзіць на работу. Якасьць уборкі, часамі, нікуды ня вартая. Былі факты, калі пасьля ўборкі ячменю прыходзілася пускаць конныя граблі і правадзіць паўторную ўборку. Кіраўнікі калгасу пальцам не паварушылі, каб спыніць гэту агіднасьць.

Ваколічнае кулацтва разгортвае шалёную агітацыю і ўсімі сіламі прабуе разваліць калгас. Кулакі выкарыстоўваюць для сваёй агітацыі найменшы непарадак у калгасе, не сустракаючы ніякага адпору. Сярод калгасьнікаў гуляе кулацкая «тэорыя» аб пайках. Многія калгасьнікі ўпэўнены, што іх «усёроўна пасадзяць на паёк».

— Будуць пайкі, а таму навошта стараацца з работай,—так разважаюць шмат якія члены арцелі.

Калгасьнікі ня маюць ніякага ўяўленьня аб дырэктывах партыі і ўраду пра разьмеркаваньне ўраджаю. Ніхто калгасьнікам не растлумачыў гэтага пытаньня. Раённы камітэт партыі, калгасная ячэйка, кіраўнікі калгасу прымірэнча адносяцца да кулацкай агітацыі.

Калгасьнікі заяўляюць:

— Мы ня ведаем за што працуем. Нас пасадзяць на паёк. Трэба павялічыць пэнсію...

А кіраўнікі ў адказ толькі махаюць рукамі.—«У нас цянер уборка,—заяўляюць яны,—не дакучайце нам з гэтым разьмеркаваньнем. Калгасьнік так ці інакш не паверыць у ваша разьмеркаваньне пакуль не атрымаюць ураджаю» —гаворыць кіраўнікі калгасу. Гэта кулацкая балбатня лепш за ўсё характарызуе кіраўніцтва раёну і калгасу. Замест таго, каб даць адпор кулацтву, каб выкрыць кулацкую хлусьню аб пайках, каб папулярызаваць дырэктывы партыі і ўраду, кіраўнікі Самахвалавіцкага раёну і калгасная ячэйка панічна енчаць: «Масы нам ня верацъ».

Што-ж прадстаўляе з сябе гэта кіраўніцтва калгасу? У праўленьне праляезьлі асобныя контр-рэвалюцыйныя элемэнты, былыя бандыты, агенты кулака. Фактычна калгасам кіруе Мезенец, былы ўдзельнік банды Балаховіча і Жураўскі, у мінулым крымінальны злачынца. Гэта шайка на вачох Самахвалавіцкага райкому партыі запраўлае буйнейшым калгасам у раёне. Гэтыя «кіраўнікі»—клясавыя ворагі, якія пад шыльдай калгасьнікаў, на радасьць кулаку, развальваюць арцель. Кулацкія агенты свайго дабіліся: у самы разгар уборкі пад уплывам усіх гэтых агіднасьцяй пачаўся адліў. Уся вёска Віцькоўшчына ўжо вышла з калгасу.

Як-жа рэагуюць на гэта калгасныя камуністыя? Як яны змагаюцца за ўборку, за сяўбу, супроць кулака? Ніяк. Яны дэмабілізаваліся, адгарадзіліся кітайскай сьцяной ад калгаснай масы. Надамо адзін невялікі характэрны факт. У цэнтры калгасу на палёх ляжалі сотні га нявыбранага лёсу, тэхнічных культур, гніла сенажаць. 11-га верасьня было добрае надвор'е. І ў гэты час дні, замест таго, каб пайсьці ў масы, мабілізаваць іх на ўборку, агітаваць за ўдарныя тэмпы работы, уласным прыкладам узьняць энтузіязм калгасьнікаў, кандыдацкал партгрупа ўвесь час засядала. Аб чым гавораць камуністыя на сваіх пасяджэньнях, калгасьнікі ня ведаюць. Потым ноччу група зноў засядала, а на полі гінуў ураджай.

Непьга адмаўляць таго факту, што значная частка калгасьнікаў працуе ад цямна да-цямна, асабліва моладзь. Калгасная моладзь, на чале з камсамольскай ячэйкай выносіць на сваіх плячох увесь цяжар работы. Моладзь змагаецца за калгас, але не сустракае ніякай дапамогі.

* * *

Бясчынствы Мезенцаў і Жураўскіх, якія пралезьлі ў кіраўніцтва арцелі, паралізуюць калгас. Становішча арцелі на сёнешні дзень катастрафічнае. Патрэбна тэрміновая дапамога. Патрэбен суровы і бязьлітасны ўдар па апарату ністых з Самахвалавіцкага райкому партыі і калгаснай парт'ячэйкі, якія дазваляюць кулацкай агэнтуры разбураць арцель. Трэба выгнаць прэч усіх гэтых Мезенцаў і Жураўскіх, неадкладна спыніць іх злачынную работу.

У прыватнасьці трэба ўзяць за ўсю шырыню пытаньне аб становішчы партыйна-савецкага кіраўніцтва Самахвалавіцкага раёну.

Задача, партыйны абавязак Самахвалавіцкай раённай арганізацыі КП(б)Б заключаецца ў тым, каб зараз-жа прыйсьці на дапамогу калгасу «Кастрычнік», каб даць зьнішчальны адпор кулацтву і замацаваць арцель.

САЛДАЦЕНКА.

Калгас «КАСТРЫЧНІК». Верасень, 1930 г.

Усебеларуская выстаўка павінна знайсьці шырокі водгук у СССР

(Гутарка са старшынёй бюджэтнай камісіі ЦВК СССР т. Чуцкаевым)

Учора ўвечары старшыня бюджэтнай камісіі СССР т. Чуцкаеў выехаў у Маскву.

Перад ад'ездам т. Чуцкаеў у гутарцы з нашым супрацоўнікам зноў спыніўся на ўражаньні, якое на яго зрабіла ўсебеларуская выстаўка.

— Непьга не адзначыць цікавую ідэю арганізацыі выстаўкі—кажа т. Чуцкаеў, пры якой яна вращіць свой выставачна-паказны характар, што звычайна ўласьціва ўсякай выстаўцы, якая арганізоўваецца ў буржуазных краінах.

Беларуская выстаўка, ва многіх частках, зьяўляецца хутчэй добра задуманай і выкананай вопытнай станцыяй. У гэтым яе вялікая вартасьць.

Зусім зразумела, чаму сяляне, якія наведалі выстаўку, запэўнялі будаўнікоў выстаўкі, што з гэтага часу яны робяцца шчырымі прыхільнікамі калгасаў.

Вынікі дзейнасьці калгасаў агітуюць за калектыўныя формы вядзеньня гаспадаркі.

Уключэньне ў выстаўку работы такіх арганізацый, як балотная станцыя, пагыбляе паказальнасьць выстаўкі. Глыбокае ўражаньне робіць агляд і азнаямленьне з экспанатамі і палямі балотнай станцыі.

Калі я ўбачыў на жывых фактах посьпехі станцыі, якіх яна ўжо дасягнула, і якія дапамогуць выкарыстаць 2 з папов. мільёна га балот, то мімаволі прышоў да выводу, што пры пэўнай увазе, сьмеласьці размаху, а галоўнае, водпуску сродкаў станцыя адыграе вялічэзную ролю ня толькі ў справе арганізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі, але і будзе мець вялікае значэньне і для ўсяго Саюзу.

Тое, з чым мне ўдалося пазнаёміцца на выстаўцы, запэўняе ў тым, што беларуская выстаўка, бязумоўна, адыграе ў справе сацыялістычнага будаўніцтва БССР вялікую ролю.

Шкада таго, што арганізацыі Украіны, Заходняй вобласьці, Ленінграду не зварачаюць на выстаўку належнае ўвагі, не мабілізуюць грамадзкае думкі працоўнага насельніцтва вакол 1-й усебеларускай выстаўкі.

Дрэнна і тое, што маскоўскія газэты не аддаюць выстаўцы тае ўвагі, якую яна заслугоўвае.

Пры азнаямленьні з дыяграмамі капітальных укладаньняў у сельскую гаспадарку, зварачае на сябе ўвагу той недахоп, што ва ўсіх дыяграмах, не адзначаны ўдзел у капітальным будаўніцтве Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

У часе сваёй работы ў цэнтры і ў бюджэтнай камісіі, я ня раз сустракаўся з думкай, што Беларусь зьяўляецца краінай, яная ня мае шырокіх пэрспэктыў для індустрыяльнага разьвіцьця. Але тое, што я ўбачыў на выстаўцы, упэўніла мяне ў поўнай нягрунтоўнасьці гэтых погляду.

Пры дапамозе СССР БССР атрымала магчымасьць разьвіць буйнае прамысловае будаўніцтва, перайсьці да сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і раней за ўсіх іншых частак СССР перайсьці да ўвядзеньня ўсеагульнага абавязковага навучаньня.

Азнаёміўшыся з жыцьцём БССР, якое выпукла паказана на выстаўцы, я пераканаўся, што ўкладзеныя ў яе будаўніцтва рэспубліканскія і саюзныя сродкі ўжо даюць вялізарныя рэзультаты.

Усё-ж тыя вялікія задачы, якія стаяць перад Саюзам і перад БССР, як яго часткай, не дазваляюць прыйсьці да выводу, што будаўніцтва можа праводзіцца ў БССР бяз удзелу саюзнага бюджэту.

БССР і надалей шпаркімі крокамі пры дапамозе працоўных усяго СССР будзе ператварацца з краіны аграрнай у краіну аграрна-індустрыяльную.

Яз. С-ны.

Тэлеграмы ТАСС'а аб выбарах у нямецкі рэйхстаг—на другой старонцы

4½ мільёны галасоў за Савецкую Нямеччыну

КАМПАРТЫЯ У БЭРЛІНЕ САМАЯ МОЦНАЯ ПА СІЛЕ ПАРТЫЯ

БУРЖУАЗІЯ—У ТРЫВОЗЕ

Кампартыя прабіла брэш у масах прыхільнікаў сац.-фашыстых

БЭРЛІН, 15. У кіраўнічых нямецкіх камуністычных колах наступным чынам ацэньваюць вынікі выбараў у рэйхстаг: **натуральным зьявішчам учарашніх выбараў зьяўляецца надзвычай вялікі посьпех кампартыі.** Партыя атрымала **па 1.300.000** больш галасоў і **на 22 мандаты больш, чым у 1928 годзе,** перавысіўшы рэкордную да гэтага часу лічбу выбараў у маі 1924 г. Гэта даказвае, што партыя магла на гэты раз прабіць брэш у масе прыхільнікаў сацыял - дэмакратаў. Пры гэтым сацыял - дэмакраты страцілі ня толькі абсалютна, але і адносна, з прычыны прыросту агульнай колькасьці ўдзельнікаў у выбарах. **Іх страты складаюць 20 проц.**

Асабліва значэньне мае **бліскучая перамога кампартыі ў Бэрліне, дзе камуністыя сталі першай партыяй па моцы.** Значэньне гэтай перамогі тым большае, што ў Бэрліне камуністым удалося затрымаць рост нацыянал - сацыялістых. Безумоўна, правільная палітыка партыі ў пытаньні барацьбы супроць фашызму, якая найбольш хутка і пасьпяхова праведзена ў жыцьцё, дала свае вынікі.

Вялікае значэньне маюць таксама разьвітаты выбараў у горадзе Эсэне, які зьяўляецца цытаделлю партыі цэнтру. Там камуністычная партыя здолела прабіць брэш у масах рабочых, якія ідуць за буржуазнымі партыямі. Асабліва важным зьявляецца той факт, што рост уплыву партыі роўнамерны ва ўсіх бяз выключэньня акругах Нямеччыны. Між тым, у 1928 годзе росту ўплыву ў адных раёнах процістаялі страты ў іншых.

Адзначаючы вялікія посьпехі партыі, кіраўніцтва лічыць неабходным далейшае самае **энэргічнае разгортваньне барацьбы супраць самакрытыкі.** Пры дапамозе гэтай самакрытыкі павінны быць выкрыты і пераможаны ўсе слабыя бакі партыйнай работы. Партыя павінна выкарыстаць посьпех на выбарах для пазапарлямэнцкай барацьбы, для арганізаванага замацаваньня ўзрастаючага руху партыі.

Кампартыя заваявала пераважную большасьць галасоў у Бэрліне

БЭРЛІН, 15. На выбарах у Бэрліне камуністычная партыя атрымала бліскучую перамогу. **Ва ўсіх рабочых раёнах Бэрліну камуністыя сабралі больш галасоў, чым сацыял - дэмакраты, а іменна, камуністыя — 749.000, сац. - дэмакраты — 738.000** У той час, як рацыі кампартыі стаяла па першым месцы толькі ў Фрыдрыхстэйне, у Вэйсэнзэі і ў цэнтральным участку Вадынгу, зараз яна сабрала больш галасоў, чым сацыял - дэмакраты таксама і ў **Прэнцлявэрбэргу, у Крэйцбэргу, Нэйкельне, Кепэніку, Ліхтэнбэргу і Рэйнікенцдорфе.** Ва ўсіх гэтых раёнах перавага кампартыі настолькі вялікая, што ліку галасоў, паданых за сацыял - дэмакратаў у буржуазных раёнах Бэрліну ледзь хапіла, каб пакрыць іх страты ў рабочых раёнах. **На цяперашніх выбарах кампартыя заваявала пераважную большасьць бэрлінскіх рабочых галасоў, а таксама вялікую колькасьць галасоў служачых і прадстаўнікоў сярэдніх колаў насельніцтва.**

Выйгрышы і страты мандатаў

БЭРЛІН, 15. У выніку выбараў у рэйхстаг выявіўся наступны малюнак выйгрышаў і страт мандатаў у параўнаньні з лікам мандатаў, які кожная партыя павінна была-б атрымаць у сувязі з павялічэньнем колькасьці выборчыкаў (для захаваньня процантных суадносін, якія існавалі ў былым рэйхстагу): сацыял - дэмакраты страцілі **36** мандатаў, г. зн. атрымалі па **20 проц.** менш. Камуністычная партыя Нямеччыны выйграла **13** мандатаў, г. зн. атрымала на 20 проц. больш; нямецкія нацыяналісты страцілі **44** мандаты, г. зн. атрымалі на 52 проц. менш, цэнтр — **5** мандатаў, г. зн. атрымаў на **5,5 проц.** менш; народная партыя — **26** мандатаў, г. зн. атрымала на **50 проц.** менш; дзяржаўная партыя — **7** мандатаў, г. зн. атрымала **на 21,5 проц.** менш; гаспадарчая партыя — **4** мандаты, г. зн. атрымала на **14 проц. менш;** баварская народная партыя — адноўкавае, нацыяналістыя (фашыстыя) выйгралі **93** мандаты, г. зн. атрымалі на **66,5** проц. больш, «ляндфольк» — **3** мандаты, г. зн. атрымаў на **20 проц.** менш, сяляне-ская партыя страціла **3** мандаты, г. зн. атрымала на **33 проц.** менш.

За перамогу кампартыі

БЭРЛІН, 15. Орган нямецкай кампартыі. «Рота Фанэ» піша: кампартыя Нямеччыны атрымала на выбарах вялікую перамогу. **4,5 МЛН. ГАЛАСОЎ—ЗА САВЕЦКУЮ НЯМЕЧЧЫНУ. БЭРЛІН, КАПАЛЬНІ І МЭТАЛЮРГІЧНЫЯ ГІГАНТЫ РУРСКАГА РАЁНУ, ФАБРЫКІ ХЭМІЧНАЙ І ТЭКСТЫЛЬНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ НІЖНЯГА РЭЙНУ, РАБОЧЫЯ ПРЫМОРСКАГА РАЁНУ, ВЕСКІ ПАЎНОЧНАЙ І ПАЎДНЁВАЙ НЯМЕЧЧЫНЫ ГАЛАСАВАЛІ ЗА ПЕРАМОГУ КАМПАРТЫІ. Перамога кампартыі перавысіла ўсе жаданьні. Праваі сацыял - дэмакратыі быў вельмі значны. Для кампартыі рэзультаты выбараў не зьяўляліся прычынай для самадавольства. Трэба імкнуцца да арганізацыі яшчэ большых мас для канчатковай барацьбы за перамогу сацыяльнай рэвалюцыі. (ТАСС).**

Нямецкі буржуазны друк аб выбарах

ПАРЫЖ, 15. Буржуазны друк, камэнтуючы вынікі нямецкіх выбараў, аднадушна канстатуе, што **перамогі фашыстых і кампартыі і разгром цэнтральнай і сацыял - дэмакратычнай партый перавысілі самыя сьмелыя надзеі.** Як падае друк, адзіны выхад са становішча, якое стварылася ў Нямеччыне, заключаецца ў арганізацыі вялікай кааліцыі з удзелам сацыял - дэмакратаў. У супраціўным выпадку, як піша газэта, **будучыня Нямеччыны «ў вялікай небясьпецы».**

Некаторыя газэты ставяць далейшае разьвіцьцё падзей у Нямеччыне ў залежнасьць ад пазыцыі Гіндэнбурга, які да цяпэшняга часу адмоўна адносіўся да праекту стварэньня вялікай кааліцыі. Буржуазны друк зварачае ўвагу на Гіндэнбурга і чакае ад яго ратунку ў становішчы, якое стварылася.

***

БЭРЛІН, 15. «Бэрлінэр Тагэблят», камэнтуючы рэзультаты выбараў, піша: «пасьля самых нядалых выбараў, якія адбываліся ў Нямеччыне, было-б вялікай памылкай што-кольвечы хаваць або недаацэньваць». Газэта падкрэсьлівае, што **возьміва вялікія страты мела сацыял-дэмакратычная партыя.**

Далей газэта зазначае, што пасьля выбараў у вельмі цяжкім становішчы будзе знаходзіцца кіраўніцтва замежнай палітыкай і гэта вынікіцца з поўнай відавочнасьцю ў бліжэйшым часе.

„Тан" аб нямецкіх выбарах

ПАРЫЖ, 15. Камэнтуючы ў перадавым артыкуле **вынікі выбараў** у нямецкі рэйхстаг, «ТАН» зазначае, што выбары **азначаюць вялікі паварот** у палітычным жыцьці Нямеччыны. Аналізуючы суадносны сіл у новым рэйхстагу, газэта піша:

«Блёк Гіндэнбурга памёр, не нарадзіўшыся. Калі Бруніг і вышаў з бойкі без вялікіх страт, дзякуючы адноснаму посьпеху яго партыі цэнтру, дык усё роўна для ўсіх, зразумела, што яго палітыка асуджана на правал і што яму прыдзецца здаць уладу. Адлюстраваньне ўсіх гэтых змен у таліне міжнародных адносін можа мець сур'ёзны характар. «ТАН» падае думку, што палітычная партыя цэнтру, ад якой залежыць, ці пойдзе кааліцыя ўлева ці ўправа, наўрад ці пойдзе на супрацоўніцтва з гітлераўцамі (фашыстымі). Паводле слоў газэты, гэта партыя на працягу 5 год брала на сябе вялікую адказнасьць за палітыку міру ў Нямеччыне. **«Вось чаму,** — працягвае «ТАН», — **калі толькі Гіндэнбург зараз не захоча адкрыць дзьверы эвантуры, больш усяго шансаў мае аднаўленьне вялікай кааліцыі».**

У чырвоным Руры

БЭРЛІН, 16. Орган нямецкай кампартыі ў Рурскай вобласьці «Рур Эха» зазначае, што пры выбарах у рэйхстаг 14 верасьня **У РУРСКАЙ ВОБЛАСЬЦІ КАМПАРТЫЯ АТРЫМАЛА ПЕРАМОГУ ПА ЎСІМ ФРОНЦЕ.**

У Рурскай вобласьці сьпіс кампартыі сабраў звыш 600.000 галасоў, т. зн. на ⅓ БОЛЬШ, ЧЫМ У ЧАС МІНУЛЫХ ВЫБАРАЎ. У выніку цяперашніх выбараў, ад рабочых Рурскай вобласьці ў рэйхстаг абрана 10 камдэпутатаў. Увогуле сацыял-дэмакратычная партыя страціла ў 4-х выбарчых акругах Рурскай вобласьці амаль 160.000 галасоў.

Далейшы рост беспрацоўя ў Нямеччыне

БЭРЛІН, 12. У Саксоніі лік беспрацоўных за час з 15 па 31 жніўня павялічыўся па **10.000 і склаў 416.700 чал.,** з якіх дапамогу атрымліваюць **толькі 193.756.** Беспрацоўе узмоцнілася, галоўным чынам у мэталюргічнай, тэкстыльнай і будаўнічай галінах прамысловасьці.

Ва ўсходняй Прусіі лік беспрацоўных за другую палову жніўня павялічыўся да **43.918** чалавек, з іх **20.397** атрымліваюць дапамогу па беспрацоўі і 5.772 так званую «крызісную» дапамогу. Пераважная большасьць звальненьняў зроблена ў сельскай гаспадарцы, будаўнічай і лясной прамысловасьці

„Канчатковае пахаваньне пан-Эўропы"

РЫМ, 16. Як перадаюць па тэлеграфу, вынікі нямецкіх выбараў зрабілі выключна **вялікае ўражаньне на ўсіх удзельнікаў пленуму Лігі Нацый.** У колах францускай дэлегацыі вялікая перамога фашыстых і кампартыі зрабіла надзвычайнае ўражаньне. У гэтых колах адкрыта гавораць аб тым, што рэзультаты выбараў азначаюць канец палітыкі франка-нямецкага супрацоўніцтва і прымусяць Францыю перайсьці на рэйкі палітыкі Пуанкарэ. Паводле агульнай думкі, якая склалася ў жэнэўскіх палітычных колах, **рэзультаты нямецкіх выбараў канчаткова пахавалі «пан-Эўропу».**

НЕ ПАСЛАБЛЯЦЬ АГНЯ БАРАЦЬБЫ

з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам!

Нацыяналістым, ухілістым і прымірэнцам да шавінізмаў ня месца ў радох партыі!

НА ДВА ФРАНТЫ

Прайшло тры месяцы пасьля XVI партзьезду. Партыя з ўсёй бальшавіцкай энэргіяй ажыцьцяўляе дырэктывы зьезду аб разгорнутым сацыялістычным наступленьні па ўсім фронце.

Арганічнай часткай наступленьня сацыялізму зьяўляецца барацьба партыі за ажыцьцяўленьне нацпалітыкі, барацьба з шавінізмамі ўсякіх кораў. Невыпадкова, што XVI зьезд, «зьезд суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як клясы, мабілізаваў увагу партыі на ўзмацненьне барацьбы з шавінізмамі.

Зьезд даў выразную дырэктыву аб барацьбе на два франты як супроць расійскага шавінізму, на які трэба накіраваць галоўны агонь, так і супроць мясцовых шавінізмаў: «Зьезд адзначае, у сувязі з абвастрэньнем клясавай барацьбы ў краіне, актывізацыю ў радох партыі нацыянальных ухілаў у бок вялікадзяржаўнага і мясцовага шавінізму.

Галоўную небясьпеку на даным этапе прадстаўляе вялікадзяржаўны ўхіл, які прабуе рэвізаваць асновы ленінскай нацыянальнай палітыкі і пад сьцягам інтэрнацыяналізму прыкрывае імкненьне аджываючых кляс пануючай раней вялікарасійскай нацыі, вярнуць сабе страчаныя прывілеі.

Побач з гэтым актывізуецца ўхіл да мясцовага нацыяналізму, які паслабляе адзінства народаў СССР і які грае на руку інтэрвэнцыі.

Партыя павінна ўзмацніць барацьбу з абодвыма ўхілена ў нацыянальным пытаньні і з прымірэнцтвам да іх, узмацніўшы адначасова ўвагу да практычнага правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі, зжываньня элемэнтаў нацыянальнай нароўнасьці і шырокага разьвіцьця нацыянальных культур народаў Савецкага Саюзу».

Факты штодзенна пацьвярджаюць правільнасьць і своячасовасьць гэтай дырэктывы XVI партзьезду. Клясавая барацьба ў нашай краіне абвастраецца. Расьце кулацкае супраціўленьне. Узмацняюць сваю актыўнасьць усякія шавінізмы—адбіткі гэтага супраціўленьня, узмацняюцца хістаньні і ўхілы ў бок іх у некаторых зьвеньнях нашай партыі.

Адным з відаў праяўленьня нацыяналістычных хістаньняў у нашай партыі зьяўляецца адмаўленьне ленінскага прынцыпу барацьбы на два франты з ухіламі ў нацпытаньні, нацыяналістычнае скажэньне лініі партыі. Беларускія нацыянал-дэмакраты, іх падгалоскі ў радох КП(б)Б «тлумачаць» дырэктыву зьезду аб накіраваньні галоўнага агню супроць расійскага шавінізму ў сэнсе паслабленьня і нават адмаўленьня ад барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам. Нацыянал-апартуністыя ў радох КП(б)Б, тэарэтыкі і практыкі нацыянал-апартунізму «забываюць» аб тым, што зьезд даў дырэктыву аб узмацненьні барацьбы на два франты.

Мы бачым у некаторых мясцох, партыйных арганізацыях і сярод паасобных камуністых паслабленьне ўвагі да беларускага нацыянал-дэмакратызму, факты прымірэнцтва да яго.

Аб чым гаворыць тое, што здарылася ў Бягомльшчыне? У той час, калі настаўніцтва Бягомльшчыны дала аднадушны адпор кулацкаму агенту — беларускаму нацыянал-дэмакрату Копціку — камуністы Радзюк, інспэктар асьветы, фактычна выступае ў яго абарону, прыкрывае нацыянал-дэмакратычную кулацкую сутнасьць копцікаўскіх разважаньняў і выпазак. Правільна паступіла фракцыя настаўніцкай канфэрэнцыі ў Бягомлі, якая кваліфікавала паводзіны Радзюка, як прымірэнцтва да нацыянал-дэмакратызму.

Зусім інакш стаяла справа ў Гомелі. Як падаем ніжэй, у гомельскім Белпэдтэхнікуме меў месца цэлы рад контрэвалюцыйных нацыянал-дэмакратычных выпазак з боку настаўніка Коршука. Але райком, які павінен быў даць палітычную ацэнку дзейнасьці і выпазкам Коршука, не ацаніў гэта, як нацыянал-дэмакратычныя выпазкі.

Партыйныя арганізацыі павінны ў сваёй штодзённай рабоце памятаць і праводзіць дырэктыву XVI партзьезду аб барацьбе на два франты з ухіламі ў нацпытаньні.

Вылазка беларускага нацыянал-дэмакрата на настаўніцкай канфэрэнцыі Бягомльшчыны

Нядаўна настаўнікі Бягомльшчыны на апошняй канфэрэнцыі выключылі з сваіх радоў настаўніка Копціка за нацыянал-дэмакратычныя тэорыі.

У кожным выступленьні, дзе толькі можна, настаўнік Копцік даводзіў наступнае: «Мы (чытай: настаўнікі — А. К.) ўтварылі камуністычную партыю бальшавікоў Беларусі. Мы ўтварылі Беларусь, беларускі адзіны народ. Селянін — наш вармілец. Мы залежым ад кулака. Быў кулак — мы былі сытыя, зараз яго ліквідавалі — настаўнікі галодныя».

Вось сума разважаньняў, якія абараняў Копцік у сваім выступленьні.

Якраз аб гэтым пяюць усе ворагі дыктатуры пралетарыяту. Аб гэтым пяюць контр-рэвалюцыйныя беларускія нацыянал-дэмакраты.

Між іншым, трэба сказаць аб некаторых камуністых і камсамольцах, якія пры выступленьні Копціка — замазалі нацыянал-дэмакратычную сутнасьць гэтага выступленьня. Інспэктар нарасьветы, камуністы **Радзюк,** у сваіх выступленьнях не мабілізаваў настаўніцтва для барацьбы з беларускім нацдэмакратызмам, а тлумачыў так:

— Копцік стары чалавек, а ўсе старыя пераходзяць у дзяцінства, якое мяжуецца з ідыятызмам. Таму выступленьне Копціка не заслугоўвае ўвагі.

І калі сакратар райкому ЛКСМБ тав. **Ватнік** патрабаваў слова для выкрыцьця Копціка і Радзюка, дык па дырэктыве Радзюка камсамолец **Чэкатоўскі,** як старшыня сходу — ня даў Ватніку слова.

Скліканая пасьля гэтага фракцыя кваліфікавала выступленьне Радзюка як прымірэнцкае.

Бюро РК КП(б)Б вынесла вымову Радзюку і зьняло з пасады інспэктара нарасьветы.

Пытаньне паводзін Радзюка было шырока абмеркавана ў партыйнай арганізацыі Бягомля, якая ўхваліла пастанову бюро, дала рашучы адпор беларускаму нацыянал-дэмакратызму і прымірэнцтву да яго, якая заклікала ўсю партарганізацыю, кожнага камуністага на актыўнае змаганьне на два фронты з нацыяналістычнымі ўхіламі—супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, і мясцовага беларускага нацыянал-дэмакратызму і шавінізму іншых колераў.

А. К.

Ім не даюць бальшавіцкага адпору

Некаторыя студэнты гомельскага Белпэдтэхнікуму ня чытаюць „Правду" таму, што „яна на расійскай мове"

XVI зьезд УсеКП(б) і XIII КП(б)Б завастрыў ўвагу партарганізацый на неабходнасьці самай рашучай і бязьлітаснай барацьбы па два фронты супроць нацыяналістычных ухілаў. «Мы ня можам ня весьці змаганьня на два фронты, бо толькі пры ўмове барацьбы на два фронты—з шавінізмам вялікарасійскім, з аднаго боку, які зьяўляецца асноўнай небясьпекай у нашай будаўнічай рабоце, і шавінізмам мясцовым—з другога, можна будзе дасягнуць посьпеху, бо бяз гэтай двухбаковай барацьбы ніякага зьнітаваньня рабочых і сялян расійскай і іншых нацыянальнасьцяй ня будзе. У праціўным выпадку можа быць заахвочваньне мясцовага шавінізму, палітыка прэміі на мясцовы шавінізм, чаго мы дапусьціць ня можам» (Сталін).

Палітыку «прэміі на мясцовы шавінізм» праводзяць у некаторых мясцох і па сёпешні дзень. Мы гаворым аб гомельскім Белпэдтэхнікуме. Аб ім «Зьвязда» ня раз пісала.

Справа Карпчука—выкладчыка літаратуры—надзвычай павучальная. Пад носам партыйнай і камсамольскай ячэек гэты выкладчык доўгі час прапагандаваў ідэі контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму. Ён зусім адкрыта прапагандаваў, што «калектывізацыя навязваецца сялянам пад прымусам», гаварыў студэнтам, што «партыя ніколі не паварачвалася тварам да сялян», што «сучасная пралетарская літаратура—гэта агітка».

У часе знаходжаньня ў вёсцы, Карпчук выступаў на сходах і параўноўваў міліцыю з гайдамакамі.

Па гэтай справе райкомам была вылучана камісія, якая ўстанавіла пералічаныя вышэй факты. Але ў прыпытай пастанове райкому партыі **зусім адсутнічала палітычная ацэнка гэтых фактаў.** Акругком партыі два разы абмяркоўваў гэта пытаньне на бюро і вылучыў спэцыяльную камісію. Але **і да гэтага часу рэзалюцыя па даным пытаньні вынесена ня была.**

Такім чынам, лёўныя прымірэнчыя адносіны да барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам з боку Райкому, партыйэйкі БПТ былі відавочны.

Выключаны ў свой час з членаў саюзу працасьветы Каршук цяпер адноўлены, атрымаў каля 600 руб. «за прагулены час» і, па чутках, цяпер Каршук працуе на рабфаку ў Воршы выкладчыкам грамадазнаўства і літаратуры. Безумоўна, і там Каршук працягвае сваю контр-рэвалюцыйную, нацыянал-дэмакратычную прапаганду.

Ігнараваньне барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, прымірэнчыя адносіны да праяў яго—садзейнічалі актывізацыі беларускага нацыяналізму ў гомельскім Белпэдтэхнікуме.

Зараз у гомельскім Белпэдтэхнікуме мы маем выпадкі, калі некаторыя студэнты адмаўляюцца чытаць маскоўскую «Правду» толькі таму, што яна падаецца на расійскай мове.

Партарганізацыя Гомельшчыны, парткалектыў гомельскага Белпэдтэхнікуму павінны павесьці сапраўдную барацьбу на два фронты супроць вялікадзяржаўнага шавінізму як галоўнай небясьпекі і супроць беларускага нацыянал-дэмакратызму і інш. шавінізмаў.

Беларускі нацыянал-дэмакрат, які выкладае зараз у Воршы—павінен атрымаць адпор з боку ўсёй пралетарскай грамадзкасьці.

К.

На раённых партканфэрэнцыях

ЛЁЗНА

Адбылася Лезьненская райпартканфэрэнцыя. Канфэрэнцыя абмеркавала задачы партарганізацыі ў правядзеньні ўборкі ўраджаю, асеньняй сяўбы і лібазагатовак, а таксама аб падрыхтоўчай рабоце да арганізацыі партвучобы.

Па пытаньні гаспадарча-палітычных кампаній у спрэчках выказалася **16 таварышоў.** Прамоўцы спыняліся на недахопах у рабоце раённай партарганізацыі, выкрываючы праваапартуністычную практыку, якая была пратулена некаторымі ячэйкамі і паасобнымі камуністымі.

Амаль усе ячэйкі раёну спынілі работу па арганізацыі новых калгасаў і папырэньні існуючых. За летні пэрыяд увайшло ў калгасы па ўсім раёне **толькі 15 гаспадарак і то у парадку самацёку.**

Многімі ячэйкамі недацэнчальна ігнаруюцца дырэктывы партыі аб рабоце з беднатой і батрацтвам. Напрыклад, пляны хлебазагатовак выносіліся на абгаварэньне агульных сходаў сялян адзінасобнікаў, **без папярэдняга абмеркаваньня іх на сходах беднаты.** У выніку такога становішча, плян хлебазагатовак па Горбаўскім сельсавеце прыняты толькі **на 40 проц.**

Ёсьць праваапартуністычныя разважаньні і прапановы з боку паасобных камуністых не разгортваць работы па хлебазагатоўках пакуль ня скончыцца поўнасьцю ўборка ўраджаю. Сакратар Добрамышленскай ячэйкі не пачынаў работы, матывуючы адсутнасьцю ў яго плану хлебазагатовак, у той час, калі гэты плян валяўся запёртым у яго шафе.

Канфэрэнцыя завастрыла ўвагу раённай партарганізацыі на задачах ліквідацыі паказаных недахопаў у рабоце.

Па пытаньні партвучобы канфэрэнцыя паставіла задачу ўцягненьня ў раённую сетку партасьветы ня менш 50 проц. рабочых, батракоў, актыву беднаты, калгасьнікаў у адносінах да ўсяго складу слухачоў. У больш населеных пунктах вызначана правесьці партыйна-камсамольскія вечары, прысьвечаныя партвучобе.

ЛЮБАНЬ

Любаньская райпартканфэрэнцыя адзначыла, што кіраўніцтва з боку парт' ячэек раёну існуючымі калгасамі і работа па арганізацыі новых праводзіцца зусім невыстарчальна. Работа па правядзеньні чарговых гаспадарча-палітычных кампаній не падпарадкавана галоўнай задачы—калектывізацыі сельскае гаспадаркі.

Пляны будаўніцтва ў калгасах ня выконваюцца, не скарыстоўваецца поўнасьцю трактарная калёна, працдысцыпліна сярод калгасьнікаў ня ўзьнята на належную вышыню, сацспаборніцтва ў рабоце ня ўжываецца. А ячэйкі на гэтыя моанты слаба рэагуюць, не аддаюць патрэбнай увагі арганізацыі працы ў калгасах.

Завастрыўшы ўвагу партарганізацыі на задачах зьніжэньня гэтых недахопаў, партканфэрэнцыя ў ліку іншых практычных мерапрыемстваў, пастанавіла ўцягнуць у прасьцейшыя першапачатковыя віды сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў ня менш 85 проц. адзінасобнікаў.

***

Склад РК канфэрэнцыя абрала ў ліку 17 членаў і 5 кандыдатаў, РКК—9 таварышоў. Пленум абраў сакратаром РК тав. **Нікіфарава** і старшынёю РКК тав. **Малінкіна.**

БЯГОМЛЬ

Скончылася па-зачарговая канфэрэнцыя бягомльскай раённай партарганізацыі. У спрэчках па дакладзе сакратара РК КП(б)Б выказалася 27 асоб, запісалася для ўдзелу ў спрэчках—73.

Прадстаўнік ЦК КП(б)Б **т. Каменштэйн,** які выступіў у спрэчках, адзначыў што работа канфэрэнцыі праходзіць пад знакам бальшавіцкай самакрытыкі і крытыкі, што сьведчыць аб тым, што арганізацыя здарова і здольна ліквідаваць прарывы, якія ёсьць у яе рабоце.

Канфэрэнцыя паслала прывітаньне ЦК КП(б)Б і газэце «Зьвязда».

Канфэрэнцыя абрала новы склад РК КП(б)Б і РКК-РСІ. Сакратаром РК выбран т. Клютко, старшынёю РКК-РСІ —т. Сакольскі.

СЛУЦАК

5 верасьня адбылася VII райпартканфэрэнцыя Слуцкага раёну. Даклад і спрэчкі выявілі рад буйных прарываў у правядзеньні ўборачнай кампаніі, асеньняй сяўбы, мабілізацыі грашовых сродкаў.

Партарганізацыя ня здолела стаць на чале кіраўніцтва правядзеньнем гэтых кампаній. У раёне шмат калгасаў, якія з уборкай і па сёпешні дзень ня справіліся. Брыгады, якія дасылаюцца на дапамогу калгасам, скарыстоўваюцца дрэнна. Так, у калгасе «КІМ» брыгада скасіла 32 га ячменю, яго ня ўбралі і ячмень зараз пачаў расьці.

Пастаноўка работы ў калгасах дрэнная.

Заданьне па разьмеркаваньні падпіскі на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» ня выканана і на 50 проц.

Да асеньняй сяўбы многія калгасы не гатовы. Яшчэ няма насеньня, не падрыхтаваны машыны і нават ня ўзьнята глеба. Ёсьць пагроза, што адзінаасобнікамі ня будзе выканана заданьне па пашырэньні пасеўнага кліну, бо штучнага ўгнаеньня не хапае.

Дрэнна стаіць справа з будаўніцтвам сьвінарнікаў. З 18—будуюцца 10.

Дэлегаты спыняліся на неабходнасьці ўзмацніць вясковыя ячэйкі, бо ёсьць ячэйкі, якія складаюцца з 2-х членаў партыі.

Бальшавіцкая самакрытыка якая была на канфэрэнцыі пакіравана на барацьбу з апартуністычнай бязьдзейнасьцю многіх ячэек, павінна быць бальшавіцкай зарукай для далейшай работы патрарганізацыі.

Скобелеў.

Адкрылася Гомельская гарадзкая партканфэрэнцыя

(Па тэлефону ад наш. спэц. кар.)

Учора в 7 гадз. увечары ў будынку гарадзкога цырку адкрылася Гомельская партканфэрэнцыя. На канфэрэнцыі прысутнічала 248 чалавек з рашаючым і 52 з дарадчым галасам. Ва ўступнай прамове тав. Хлеўнікаў застанавіўся на задачах, якія стаяць перад канфэрэнцыяй.

Абраны прэзыдыум у складзе 35 асоб. Сярод іх — т.т. Жаброўскі, Рубін, Дамідовіч, Эпштэйн, Каравін, Дзухам і інш.

У склад ганаровага прэзыдыуму абрана Палітбюро ЦК УсеКП(б) і т.т. Арджанікідзэ, Гей, Ленскі і Тэльман.

Канфэрэнцыя паслала прывітаньне ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б, «Зьвязьдзе» і КПН.

З дакладам аб чарговых задачах Гомельскай партарганізацыі выступіў тав. Хлеўнікаў.

1-ы Усебеларускі зьезд па палітэхнічнай асьвеце

Барацьба за палітэхнізм—барацьба ўсёй пралетарскай грамадзкасьці

З уступным словам пры адкрыцьці палітэхнічнага зьезду выступіў Наркамасьветы БССР—тав. **Платун.**

— Першы ўсебеларускі палітэхнічны зьезд,—сказаў тав. **Платун,**—адкрываецца ў важнейшы гістарычны пэрыяд агульнага сацыялістычнага наступленьня рабочай клясы, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, па ўсім фронце. Мы прыступілі да канчатковага выкарчоўваньня капіталістычных элемэнтаў.

У цяперашні пэрыяд рэканструкцыі нас ня можа задаволіць так званы нэйтральны культурны работнік. Нэйтралізм у даных умовах мяжуецца са шкодніцтвам. З гэтае прычыны партыя ставіць пытаньне рубам: калі з намі, дык за актыўную барацьбу на фронце культурнай рэвалюцыі, за пралетарскую ідэалёгію, а калі не—дык нам такія культурныя работнікі непатрэбны.

У БССР вакол пытаньняў правядзеньня нацыянальнай палітыкі адбываецца жорсткая клясавая барацьба. Усякі ўхіл ад генэральнай лініі партыі ў нашых умовах пераплятаецца з нацыянальнымі момантамі. Пытаньне аб кадрах у нас набывае асаблівае значэньне. Нам трэба рыхтаваць кадры культурных работнікаў, якія былі-б сапраўды актыўнымі барацьбітамі за сацыялістычнае будаўніцтва, якія-б замацоўвалі дыктатуру пралетарыяту.

Па якой-жа сыстэме іх рыхтаваць? Тая школа, якая зараз існуе ў нас, у значнай меры не адпавядае патрабаваньням рэканструкцыйнага пэрыяду. Наша школа, асабліва масавая, зьяўляецца славеснай школай: У большай сваёй частцы яна калечыла маладое пакаленьне, не даючы яму выхаду да жыцьця.

Трэба будаваць такую школу, якая сапраўды адпавядала-б задачам рэканструкцыі народнай гаспадаркі і ўзятым тэмпам сацыялістычнага будаўніцтва. Для гэтага трэба існуючую школу рэарганізаваць, зрабіць яе працоўнай, палітэхнічнай, дзе вучоба была-б цесна ўвязана з вытворчымі працэсамі. Такую школу трэба пачаць арганізоўваць **ужо з гэтага году.**

Жыцьцё паказала, што камсамол меў рацыю ў сваёй барацьбе з НКА за палітэхнізацыю школы. Усе масавыя школы павінны быць перабудаваны па тыпу ФЗВ і ШКМ, каб праз некаторы час усю нашу школу зрабіць палітэхнічнай.

Такую школу ня можа будаваць толькі НКА. Пакуль за гэтую справу ня возьмуцца гаспадарчыя органы, прафсаюзы, камсамол, пакуль самі шырокія рабочыя масы не прапяць актыўнасьці ў гэтай справе, да гэтага часу сур'ёзна гаварыць аб палітэхнізацыі школы ня прыходзіцца.

Зьверху—Нарком асьветы т. Платун робіць даклад. Унізе—рабочы ф-кі «Кастрычнік»—вітае зьезд.

***

Выступіўшы з прывітаньнем ад імя 2.000 рабочых менскай шэйнай фабрыкі «Кастрычнік» тав. **Лейбовіч** заявіў:

— Нашы шэйнікі ўпарта працуюць над дзівідацыяй прарываў, каб выканаць пяцігодку за чатыры гады. Наш шэйнік добра разумее, якое значэньне мае для пасьпяховага выкананьня пяцігодкі палітэхнізацыя школы і абяцае вылучыць з свайго асяродзьдзя лепшых рабочых на культурны фронт.

— Мы,—сказаў **прадстаўнік менскага мэтапязаводу «Камунар» т. Гарбачоў,**—спадзяемся, што зьезд пасьпяхова вырашыць усе пытаньні, зьвязаныя з палітэхнізацыяй школы, якая сустракае ўхваленьне ўсёй рабочай масы.

Прадстаўнік ЦК ЛКСМБ т. Рубенчык, пітаючы зьезд, падрабязна спыніўся на барацьбе камсамолу за палітэхнізацыю і на задачах, якія стаяць перад камсамольскімі арганізацыямі ў сувязі з правядзеньнем палітэхнізацыі. Тав. Рубенчык запрапанаваў гэтую справу перавесьці на рэйкі **сацыялістычнага спаборніцтва.**

— Камсамол,—сказаў ён, будзе ўпарта змагацца за рашучае ажыцьцяўленьне палітэхнізацыі і дасьць жорсткі адпор усім ня ворагам!

Тав. Піраціньскі, выступіўшы з прывітаньнем ад імя НКА РСФСР сказаў:

— Да гэтага часу былі толькі гутаркі аб палітэхнізацыі. Сёлета мы бязумоўна дабіўся раду практычных дасягненьняў у гэтай галіне. **Надыходзячы год будзе пераломным.** Довадам гэтага зьяўляецца сёпешні зьезд.

Палітэхнізацыя школы з вузка-пэдагагічнай абярнулася ў важнейшую **гаспадарча-палітычную праблему.** Яна ўжо стала ўласнасьцю шырокіх мас. Палітэхнізм пачаў выхоўвацца ў рабочай масе. Без падтрыманьня шырокіх мас рабочых будаваць палітэхнічную школу немагчыма. У інтарэсах пасьпяховага правядзеньня палітэхнізацыі трэба абменьвацца вопытам у гэтай галіне ўсім саюзным рэспублікам.

Тав. Піраціньскі скончыў сваю прамову цжаданьнем НКА БССР і РСФСР ажыцьцяўіць гэтую справу ў парадку сацыялістычнага спаборніцтва.

Выступленьнем прадстаўніка **менскай гарбарні «Бальшавік» т. Карпенка,** які абяцаў поўнае падтрыманьне палітэхнізацыі з боку рабочых, скончылася першае пасяджэньне зьезду.

***

Учора 16-га верасьня на раніншім пасяджэньні з дакладам «Рэканструкцыя народнае гаспадаркі і палітэхнічная асьвета» выступіў нарком асьветы БССР тав. Платун.

Увесь час пасьля дакладу да 3-й гадзіны і пасьля перапынку ішлі спрэчкі па гэтым дакладзе. Усяго запісалася каля 40 прамоўцаў. Выказалася больш паловы.

Набудуем дырыжабль імя „Правды"

Рабкоры „Зьвязды" на пабудову дырыжабля

Група рабкораў «Зьвязды» — **Добры, Персон** (ПРК), **Дорскі** (Дом ураду), **Батурын** (дап. дзецям), **Романаў** («Камунар»), **Бязродны** (Зьвод), **Выдэрман** (Белжылсаюз), **Сьвірноўскі** (Белдзяржгандаль), **Берштэйн** (дап. «Пралетары»), вітаючы ініцыятыву газ. «Правда» аб зборы сродкаў на пабуд

ДАДАТКОВЫ СУСТРЭЧНЫ

рыхтуюць рабочыя гомельскага заводу „Пралетары“

— Ці можна лічбы нашага сустрэчнага назваць канчатковымі?—пытае „Чырвоная Вагранка“
— Не, мы зрабілі шмат, але ня ўсё,—адказваюць брыгады і цэхі

НОВЫЯ ДЗЕСЯТКІ РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ—ГАРАНТЫЯ ПОСЬПЕХУ НОВАГА ПАЧЫНУ ПРАЛЕТАРЦАЎ

ПРАВЕРЦЕ, ЦІ ЎЛІЧАНЫ ЎСЕ ВАШЫ ВЫТВОРЧЫЯ МАГЧЫМАСЬЦІ,—ЗАКЛІКАЮЦЬ ПРАЛЕТАРЦЫ РАБОЧЫХ ІНШЫХ ФАБРЫК І ЗАВОДАЎ БССР

Рапартуйце аб датэрміновым выкананьні пляну

Паведамляйце аб падрыхтоўцы да трэцяга году

ХТО АТРЫМАЕ СЬЦЯГ УсеЦСПС?

УСІМ РАБОЧЫМ УДАРНІКАМ
УСІМ ПРАФАРГАНІЗАЦЫЯМ

Прэзыдыум УсеЦСПС устанавіў вышэйшую ўзнагароду для лепшага прадпрыемства Саюзу—пераходны чырвоны сьцяг УсеЦСПС. Заваяваць чырвоны сьцяг УсеЦСПС—абавязак гонару кожнага заводу, кожнага цэху, кожнага брыгады, кожнага ўдарніка. ДА КАНЦА ГАСПАДАРЧАГА ГОДУ ЗАСТАЛОСЯ ЛІЧАНЫХ 16 ДЗЁН. У адказ на адозву ЦК партыі і УсеЦСПС лепшыя прадпрыемствы, якія змагаюцца за сьцяг, гэраічным напружаньнем волі і энтузіязму перадавой часткі рабочае клясы датэрмінова заканчваюць гадавую праграму, заканчваюць зьвёрстку прамфінпляну, арганізуючы найлепшую сустрэчу трэцяга году пяцігодкі.

У БАРАЦЬБЕ ЗА БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ Ў МЕСЯЧНІК ШТУРМУ ПРАРЫВАЎ, БАЙЦЫ ЗА СЬЦЯГ ПАВІННЫ ВЫСТУПІЦЬ НА ПЕРАДАВУЮ ЛІНІЮ АГНЯ. Рад прадпрыемстваў (маскоўскі завод ім. Лепсэ і інш.) ужо закончылі гадавую праграму з перавышэньнем, паказаўшы ўзоры сапраўднай перабудовы работы.

Штаб па прысуджэньні пераходнага сьцягу пры УсеЦСПС і рэдакцыі газэты «Труд» зварачаецца да ўсіх прадпрыемстваў, да ўсіх ударнікаў, з гонарам выканаўшым гадавую праграму, з заклікам: шлеце ў штаб рапарты аб датэрміновым выкананьні прамфінпляну, на шырокіх канфэрэнцыях ударнікаў абгаварвайце кандыдатуру вашага прадпрыемства на заваяваньне сьцягу, выпучайце адначасова лепшых ударнікаў у якасьці кандыдатаў на ордэн працоўнага сьцягу, ордэн Леніна і г. д.

Месячнік штурму прарываў павінен паслужыць новым магутным стымулем для барацьбітоў за сьцяг. Толькі тое прадпрыемства варта сьцягу УсеЦСПС, якое ў месячнік штурму давядзе, што яно сапраўды здольна мабілізаваць шырокія масы на ліквідацыю прарыву, на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, на ўзьняцьце сацспаборніцтва і ўдарніцтва на вышэйшую ступень.

Толькі тое прадпрыемства варта сьцягу УсеЦСПС, якое пакажа ўзоры сапраўды бальшавіцкай падрыхтоўкі да 3-га году пяцігодкі, якое дасьць лепшыя паказальнікі па сустрэчным прамфінпляне, па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і пабаявому правядзе калдагаворную кампанію.

КАНВЭЕР РАПАРТАЎ АБ ДАТЭРМІНОВЫМ ВЫКАНАНЬНІ ПРАМФІНПЛЯНУ І ЛЕПШАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ТРЭЦЯГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ—ЛЕПШЫ АДКАЗ БАРАЦЬБІТОЎ ЗА СЬЦЯГ НА АДОЗВУ ЦК ПАРТЫІ І УсеЦСПС.

Заводы, фабрыкі, капальні, пабудовы! Жалезнымі батальёнамі, пабальшавіцку выступайце ў першых радох штурм, дабецеся вышэйшай узнагароды—чырвонага сьцягу УсеЦСПС.

ШТАБ ПРЫСУДЖЭНЬНЯ СЬЦЯГУ
РЭДАКЦЫЯ «ТРУД».

15-IX-30 г.

Інжынэраў—на прадпрыемствы

Для дапамогі прадпрыемствам лепш падрыхтавацца да дня ўдарніка—1-га кастрычніка—прэзыдыум БелМБІТ'у мабілізаваў усіх сваіх членаў і кандыдатаў і пакіраваў іх на прадпрыемствы. На «Эльвод» пасланы тав. **Каплан**, на «Энэргію»—**Сафарэвіч**, на завод «Полымя Рэвалюцыі»—**Аўчыньнікаў**, «Камунар» — **Новаш**, Дрэвапрацоўшчык»--**Самонаў**, «Бальшавік»—**Натансон**, «Пралетары» — **Савіцкі**, шпалерную фабрыку—**Млоцін**, «Кастрычнік»—**Гальдштэйн**, «Чырвоную Зару»—**Кіпрыянец** і па «Беларусь»—**Мількаманові**ч.

Усім ІТС запрапанавана вылучыць сваіх прадстаўнікоў у брыгады, якія ствараюцца адпаведнымі саюзнымі арганізацыямі ў парадку выкананьня дырэктыў ЦК УсеКП(б) і УсеЦСПС.

Усе інжынэра-тэхнічныя работнікі заклікаюцца прыняць непасрэдны ўдзел у барацьбе з прарывамі і ў арганізацыі ўсесаюзнага дня ўдарніка.

За лепшую работу—на 7-гадзінны

Заўчора рабочыя друкарні імя Сталіна сьвяткавалі яшчэ адну перамогу на фронце гаспадарчага будаўніцтва. На ўрачыстым вечары ў клюбе друкароў было абвешчана, што ЗА ЛЕПШУЮ РАБОТУ ПА ВЫКАНАНЬНІ ПРАМФІНПЛЯНУ ўдарны машынны цэх друкарні ДАТЭРМІНОВА ПЕРАВОДЗІЦЦА НА 7-ГАДЗІННЫ РАБОЧЫ ДЗЕНЬ.

У адказ на прывітаньні ТАВ. ЧАРВЯКОВА і раду прадстаўнікоў ад ЦП саюзу друкароў, БДВ і іншых, рабочыя машыннага цэху выступілі з заявай, што яны высоўваюць на 1930-31 год сустрэчны прамфінплян, які павялічвае кантрольныя лічбы НА 10 ПРОЦ.

Рабочыя друкарні паслалі тав. Сталіну, ЦК КП(б)Б і Фрунзаўскаму райкому КП(б)Б тэлеграмы наступнага зьместу: «Выканалі другі год пяцігодкі на 100 проц. Гатовы да сустрэчы трэцяга году». С. КАГАН.

Пачаць падрыхтоўку да перазаключэньня калдагавораў

(Гутарка з загадчыкам сэктару вытворчасьці і зарплаты ЦСПСБ т. Камэнштэйнам)

Калдагаворная кампанія па Беларусі ў гэтым годзе, у пропівагу нашай звычайнай практыцы, праводзіцца з такім разьлікам, каб яна была скончана **да 16-га кастрычніка** і каб калдагавары ўступілі ў моц з 1-га кастрычніка, г. зн. з пачатку новага гаспадарчага году.

Чым выклікана такая пасьпешнасьць у правядзеньні калдагаворнай кампаніі?

Дагэтуль мы мелі ў практыцы выпадкі, калі заключэньне калдагавораў зацягвалася на месяцы і рабочыя часта ня ведалі на працягу некалькіх месяцаў, па якіх умовах яны працуюць.

Патрэбна таксама поўная ўвязка калдагаворнай кампаніі **з ліквідацыяй прарываў** і мабілізацыя ініцыятывы і актыўнасьці ўсёй рабочай масы вакол пытаньняў трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Сёлета прынят прынцып заключэньня калдагавораў па прадпрыемствах **паміж заводакіраўніцтвамі і фабкомамі**, зусім адмаўляючыся ад генэральных дагавораў. Што новага ўносіцца ў калдагавары?

У новых калдагаварох значна кашыраюцца **ўзаемныя абавязацельсты**, шляхам уключэньня ў іх асноўных паказальнікаў прамфінпляну.

Заводакіраўніцтвы павінны будуць узяць на сябе абавязацельсты **аб поўным давядзеньні прамфінпляну да цэху, агрэгата і рабочага месца, поўным ажыцьцяўленьні адзіначальля і сваячасовага выкананьня рабочых прапаноў, асабліва па рацыяналізацыі.**

У адносінах рабочага забесьпячэньня гаспадарчыя арганізацыі павінны будуць не на словах, **а на справе аказаць практычную і фінансавую дапамогу каапэрацыі ў справе паляпшэньня забесьпячэньня рабочых.**

Па пытаньнях зарплаты бярэцца ўстаноўка **на больш правільнае ўстанаўленьне ўзроўню зарплаты ўнутры даной галіны прамысловасьці і па раёнах.**

У аснову рэгуляваньня зарплаты прадпрыемства будуць пакладзены прынцыпы: **падцягваньне адстаючых груп кваліфікаванай працы, ствараючы тым самым стымул на павышэньне іх кваліфікацыі і прадукцыйнасьці працы, падцягваньне зарплаты дэфіцытных груп працы, ствараючы стымул для замацаваньня іх на вытворчасьці, і выраўніваньне зарплаты рабочых аднолькавай кваліфікацыі.**

Для больш правільнага рэгуляваньня зарплаты ствараецца спэцыяльны фонд.

У адносінах прававой і бытавой часткі калдагавораў прадугледжваецца цэлы рад момантаў. Асноўныя з іх—**прыём на работу членаў сем'яў рабочых, у першую чаргу доўга працуючых на вытворчасьці, а таксама рабочых, якія замацоўваюцца для работы на прадпрыемстве да канца пяцігодкі.** Павінна быць таксама агавораца і палепшаньне абслугоўваньня, абсталяваньне, пабудова памяшканьняў і г. д. **для фабзавучаў.**

У новых калдагаварох будзе таксама ўключана пытаньне **аб рабочым жыльлёвым будаўніцтве, будаўніцтве сталовак, ясляй і інш. бытавых устаноў.**

ЦСПСБ і ВСНГ мабілізуюць групу работнікаў ЦП і гаспадарчых аб'яднаньняў, якія пасылаюцца па месцы для кіраўніцтва калдагаворнай работай.

Дана дырэктыва фабкомам і гаспадарчым арганізацыям **аб неадкладнай праверцы выкананьня дзейнічаючых дагавораў.**

Павінны быць праверены як дзейнічаючыя дагавары, так і асульнае становішча выкананьня прамфінпляну на прадпрыемстве, выкананьне дагавораў па ахове працы, а таксама па жыльлёвым і сацыяльна-бытавым будаўніцтве.

У часе праверкі выкананьня калдагавораў будзе арганізаваны **збор рабочых прапаноў, якія павінны атрымаць сваё адлюстраваньне ў новых калдагаварох.**

Уся праверачная работа павінна быць скончана да 1-га кастрычніка.

Не у габінэтах, а у масах

Адозва ЦК УсеКП(б) аб ліквідацыі прарываў і падрыхтоўцы да трэцяга году пяцігодкі ўзварушыла масы працоўных. Абавязацельства не пакідаць прадпрыемстваў да канца выкананьня генэральнага пляну, новыя ўдарныя брыгады, шырокая хваля сустрэчных прамфінпляну, канкрэтныя абавязацельствы па павышэньні прадукцыйнасьці працы,—усё гэта яскравае выяўленьне ўздыму энэргіі і актыўнасьці рабочых БССР у адказ на заклік кіраўніка бальшавіцкай партыі. На некаторых фабрыках і заводах мы маем ужо значны РОСТ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦІ. На «Пралетары» першая дэкада верасьня дала 132 проц. пляну, «Дрэваапрацоўшчык» ліквідаваў сваю запазычанасьць за мінулыя месяцы, «Беларуска» таксама павялічыла выпуск прадукцыі і г. д.

У будучым гаспадарчым годзе мы павінны зрабіць новы буйны крок наперад па шляху індустрыялізацыі краіны. Калі ў 1929-30 г. мы дабіліся 60 проц. павялічэньня прадукцыі, дык 1930-31 г. павінен даць 110 проц. росту. Такім чынам, для выкананьня пляну трэцяга году нам трэба дабіцца Ў ДВА РАЗЫ БОЛЬШЫХ ТЭМПАЎ.

Гэтыя грандыёзныя задачы накладваюць свой адбітак на ўсю падрыхтоўчую работу да сустрэчы трэцяга году пяцігодкі. Мы можам дабіцца і дзе'ёмся перамогі ў новым гаспадарчым годзе пры ўмове поўнага СКАРЫСТАНЬНЯ ЎСІХ СКРЫТЫХ МАГЧЫМАСЬЦЯЎ, прадпрыемстваў, пры іх поўнай нагрузцы.

Вось чаму партыя надае такое вялікае значэньне СУСТРЭЧНЫМ прамфінплянам. Самі рабочыя вывучаюць магчымасьці кожнага асобнага варштату і агрэгату. Непасрэдныя ўдзельнікі вытворчасьці выяўляюць скрытыя рэсурсы, паказваюць на перашкоды, якія тармозяць нармальны ход работы. Пляны трэстаў, аб'яднаньняў правяраюцца плянамі зьнізу, плянамі складзенымі сямімі масамі. У гэтай МАСАВАЙ ПРАВЕРЦЫ ПЛЯНАЎ, у гэтым МАСАВЫМ ПЛЯНАВАНЬНІ і сутнасьць кампаніі па арганізацыі сустрэчных.

БЯЗ МАС—НЯМА СУСТРЭЧНАГА. Ня гледзячы на гэта, мы сустракаемся з асобнымі спробамі бюракратызацыі важнейшага палітычнага мерапрыемства. Замест таго, каб абудзіць актыўнасьць мас, каб накіраваць ее па адпаведным рэчышчы, сям-там прабуюць дэкрэта ваць сустрэчны, ПАДМЕНЬВАЮЦЬ ВЯЛІЗАРНУЮ МАСАВУЮ РАБОТУ ЗАГАДАМ ЗЬВЕРХУ.

Ці прадстаўляе якую-небудзь каштоўнасьць сустрэчны, праведзены фабрычным трыкутнікам бяз удзелу шырокіх мас рабочых? Ці патрэбна каму небудзь такое палітычнае выпустошваньне падрыхтоўкі да трэцяга году пяцігодкі? Адказ, здаецца, зразумелы.

Але паглядзеце, што робяць на некаторых нашых прадпрыемствах.

Фабрыка «Кастрычнік». Тут клясычны прыклад АПАРТУНІСТЫЧНАГА СКАЖЭНЬНЯ ідэі сустрэчнага прамфінпляну. Адміністрацыя склала яўна ПЕРАПАМЕНШАНЫЯ кантрольныя лічбы. Прафэсыянальныя арганізацыі наклалі свой ШТАМП. «Давайце сустрэчны»,—ЗАГАДАЛІ пасьля гэтага прафбюракраты цэхавым прафупоўнаважаным. Калі-ж перадавыя рабочыя спрабавалі разабрацца ў кантрольных лічбах, калі яны сталі паказваць на шляхі і магчымасьці павялічэньня пляну,—яны сустрэлі СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕ з боку прафапартуністых. «Навошта вельмі павялічваць плян»,—пераконвалі апошнія рабочых. «Нам трэба мець «лазейку». Лепш узяць меншую лічбу, каб пягчэй выканаць плян».

Віцебская абутковая фабрыка. Фабком пастанавіў пачаць прапрацоўку сустрэчнага... РОСПУСКАМ ШТАБУ БАРАЦЬБЫ СА СТРАТАМІ. Як быццам барацьба са стратамі не зьяўляецца галоўнай сустаўной часткай сустрэчнага. Як быццам можна прыцягнуць масы да выяўленьня скрытых рэсурсаў, адштурхнуўшы іх ад удзелу ў барацьбе са стратамі.

Копыскія кахляна-плітачныя заводы. Тут сустрэчны плян высунула нарада адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу заводаў з удзелам прадстаўнікоў трэстаў. А РАБОЧЫЯ? ЯНЫ НАВАТ НЯ ВЕДАЮЦЬ КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАЎ. Партыйная ячэйка, камсамол у баку. І ня дзіва, што ўдарныя брыгады на гэтых заводах разваліваюцца.

На некаторых іншых фабрыках сустрэчны распрацоўваецца ТОЛЬКІ ФАБКОМАМІ І НЕВЯЛІКАЙ ЖМЕНЬКАЙ АКТЫВУ. Нават на «Энэргіі»—гэтым перадавым прадпрыемстве Менску, дзе мы зьяўляемся сьведкамі вялізарнага ўздыму актыўнасьці, дзе ўзьніклі новыя «сквозные» брыгады, дзе шмат якія пралетары добраахвотна працуюць у выхадныя дні,—нават тут ёсьць яшчэ рабочыя, якія НЯ ВЕДАЮЦЬ СУТНАСЬЦІ СУСТРЭЧНАГА ПРАМФІНПЛЯНУ і нічога ня чулі аб «сквозных» брыгадах.

У сьвятле гэтых фактаў вялікае палітычнае значэньне мае НОВЫ ПАЧЫН РАБОЧЫХ «ПРАЛЕТАРА», аб якім мы падрабязна паведамляем у сёнешнім нумары «Зьвязды».

Пралетарцы, дакладна вывучыўшы магчымасьці прадпрыемства, павысілі кантрольныя лічбы, прапанаваныя адміністрацыяй, НА 1.130 ТЫС. РУБЛЁЎ. Сабекошт зьніжаецца з 11,1 да 12,6 проц. Прадукцыйнасьць працы ўзрастае з 18 р. 98 к. на кожнага рабочага да 21 р. 20 к. Кантрольныя лічбы будучага году даведзены да кожнага рабочага, да кожнага варштату.

Але ці супакоіліся пралетарцы на гэтых вялікіх посьпехах? Ці спачываюць яны на лаўрах? Ці лічаць яны магчымым абмежавацца дасягнутым?

Рабочыя гомельскага «Пралетара» далі ПРАЛЕТАРСКІ АДКАЗ на гэтыя пытаньні.—Мы зрабілі шмат, але ня ўсё,—кажуць яны. Нашыя дасягненьні вялікія, але невыстарчальныя. Шмат чаго яшчэ можна дарабіць, рацыяналізацыя адкрывае новыя шырокія пэрспэктывы.

Пралетарцы пачалі ПРАВЕРКУ СВАЙГО СУСТРЭЧНАГА. Максымальна нагрузіць завод, даць дзяржаве ўсё, што толькі магчыма,—вось пёзунг, пад якім праходзіць гэта новая кампанія.

«Пралетары» паказвае як трэба пабальшавіцку падыходзіць да арганізацыі сустрэчнага прамфінпляну.

НЕ ФАРМАЛЬНА, НЕ Ў ГАБІНЭТАХ, А Ў МАСАХ, РАЗАМ З ІМІ ПАВІННА ІСЬЦІ ПАДРЫХТОЎКА ДА ТРЭЦЯГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ. У гэтым зарука нашых новых рашаючых перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Да гэтага клічуць рабочыя «Пралетара» іншыя заводы і фабрыкі БССР.

Вучэцеся ў пралетарцаў

Энтузіязм, памножаны на кіраўніцтва

Гомельскі машына-будаўнічы завод «Пралетары» падагуліў вынікі сусрэчнага прамфінпляну. Энтузіязм тысячнага калектыву, памножаны на цьвёрдае і ўмелае парт. і прафкіраўніцтва даў зьдзіўляючыя вынікі. Калі кантрольныя лічбы вызначалі рост прадукцыі ў 1930-31 годзе на 29,4 проц. (з 3.400 тыс. руб. да 4.400 тыс. руб.), дык **сустрэчны прамфінплян** павялічыў гэты процант **да 52,6.** (5.530 тыс. руб.).

Характэрна, што лішніх 1.130 тыс. руб. пралетарцы дабіліся, галоўным чынам, **узьняцьцем прадукцыйнасьці працы**, лепш разьлічыўшы свае сілы і магчымасьці. У бягучым годзе на кожнага рабочага прыпадала прадукцыі на 16 руб. 50 кап. у дзень. Кантрольныя лічбы на 1930-31 год вызначалі прадукцыйнасьць працы ў 18 р. 98 к., рост на 15 проц. **Сустрэчны прамфінплян**, набудаваны на нормах, **запрапанаваных самімі рабочымі**, вызначае прадукцыйнасьць працы на аднаго рабочага ў дзень на 21 р. 20 к., або **на 28,5 проц. больш, чым у гэтым годзе.**

Колькасны рост прадукцыі, значны ўздым прадукцыйнасьці працы і сотні рацыяналізатарскіх прапаноў рабочых з дакладна разьлічанай эканоміяй далі магчымасьць яшчэ больш зьнізіць сабекошт: **замест 11,1 проц.** паводле кантрольных лічбаў—**12,6 проц. паводле сустрэчнага.**

Такі эканамічны балянс перамогі сустрэчнага прамфінпляну на заводзе «Пралетары».

Паражэньне апартуністых —перамога рабочых

Трэба ўлічыць, што ўсе гэтыя посьпехі мы маем на заводзе, які яшчэ зусім нядаўна стаяў пад пагрозай чорнай дошкі, па заводзе, які ганебна адставаў у выкананьні праграмы, і дзе безгаспадарчасьць і бясплянавасьць спаборнічалі з рвацтвам і недысцыплінаванасьцю. Уздым актыўнасьці рабочых, які пачаўся пасьля перавыбараў старога заўкому разам з яго апартуністычна настроеным старшынёй, **вырас у магутны рух за барацьбу з апартунізмам, за выкананьне прамфінпляну, за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.**

Ужо жнівень даў выкананьне праграмы на 122,4 проц., але прарыву пакрыць ня мог. Не хапіла яшчэ 2,6 проц., каб ліквідаваць 11-цімесячную запазычанасьць другога году пяцігодкі.

Сустрэчны прамфінплян ня толькі давёў кантрольныя лічбы новага году да кожнага варштата. Пільная яго прапрацоўка дапамагла давесьці і стары прамфінплян да кожнага рабочага.

Рэшта гадавой праграмы была разьбіта на тры дэкады верасьня і **даведзена да варштата.** Гэта мерапрыемства **аказалася рашаючым.** Першая задача верасьня дае рэкордзнае выкананьне праграмы—**132,8 проц. і перавыкананьне 1/3 рэшткі праграмы на 2,4 проц.** Такім чынам, вынікі першай дэкады даюць цьвёрдую ўпэўненасьць у тым, што **пралетарцы поўнасьцю ліквідуюць сваю запазычанасьць краіне.**

Толькі без „головокружения“!

Гэтыя посьпехі могуць закруціць галаву. Асабліва пасьля нядаўніх паражэньняў. Але ўсе даныя гаварыць за тое, што **здароваму ва ўсіх адносінах калектыву «Пралетары» гэта небясьпека покуль не пагражае.** Ня гледзячы на ўсе буйныя посьпехі апошніх месяцаў, ня гледзячы на дасканала закончаную прапрацоўку сустрэчнага прамфінпляну, **пралетарцы ня думаюць адпачываць на лаўрах.**

У сваёй заводзкай шматтыражцы **«Чырвоная Вагранка»** пралетарцы разгортваюць зараз вялікую кампанію **за далейшае разьвіцьцё сустрэчнага прамфінпляну,** ставячы пытаньне: **«Ці можна лічбы сустрэчнага назваць канчатковымі?»** І адусюль, з усіх цэхаў і аддзяленьняў чуецца адзін адказ: **«Канчатковымі назваць нельга, сустрэчны прамфінплян можа быць яшчэ павялічаны».**

Слова энтузіястым пяцігодкі

Вось, што гаворыць стары кацельшчык з 30-цігадовым вытворчым стажам, **т. Марозаў:**

— Кацельны цэх можа даць значна больш таго, што вызначана сустрэчным прамфінплянам. Калі сабраць у адно месца брыгаду па зборды рам для растворамяшалак, калі ім ня прыдзецца бегаць за драбніцамі з аднаго канца цэху ў другі, дык прадукцыйнасьць працы ў брыгадзе павысіцца. Трэба правесьці цэлы рад паляпшэньняў: электрыфікаваць краны, набыць ручныя бормашыны, пашырыць плошчу цэху, а галоўнае, сваячасова, без перабояў забясьпечваць матар'ялам».

Гаворыць **т. Хаўкін**—токар з 27-мі гадовым вытворчым стажам:

— Прамфінплян па-за ўсякім сумненьнем можа быць у працэсе работы значна павялічаны. Трэба для гэтага цьвёрда замацаваць пэўны від работы за пасобнымі варштатамі; паставіць на пескладаную работу малакваліфікаваных рабочых, а, галоўным чынам, выконваць рабочыя прапановы.

Гаворыць **т. Мельцэр**—фармаўшчык медна-ліцейнага цэху:

— Лічбы сустрэчнага прамфінпляну па нашым цэху нельга назваць канчатковымі. Яны могуць быць павялічаны, калі правесьці рад рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў. Напрыклад: паставіць фармовачныя машыны, ахаладжаць сушку, даваць лёгкаважныя і праверaныя мадэлі, нармальна забясьпечваць фармовачную матар'ялам і зямлёй, а таксама ўстанавіць вэнтыляцыю ў цэху.

Свой голас далучае і нам. майстра такарнага цэху **т. Шапіра.**

— Трэба ажыцьцявіць рад мерапрыемстваў і сустрэчны прамфінплян на 1930-31 гаспадарчы год будзе павялічаны. Да гэтых мерапрыемстваў трэба аднесьці павялічэньне трэцяй зьмены ў такарным і другой зьмены ў сьлясарным, цашырэньне тэрыторыі такарнага і зборачнага цэхаў, капітальны рамонт варштатаў, набыцьцё цэнтровачнага і шліфовачнага варштатаў і інш.

Не застаецца ў баку і нам. старшыні заўкому **т. Дрыц:**

— Вузкае месц на нашым заводзе—кадры. Варштаты павінны працаваць 24 гадзіны ў суткі, а рабочых не хапае. Трэба перамагчы гэта і тады ў нас у такарным і арматурным цэхах будуць працаваць поўныя тры зьмены. Трэба паставіць да варштатаў на масавую работу малакваліфікаваных рабочых, якія працавалі-б пад кіраўніцтвам высокакваліфікаваных рабочых 7 і 8 разрадаў. **Пры гэтай умове мы зможам павялічыць наш прамфінплян.**

68 проц. згубленых магчымасьцяй

У тым-жа нумары **«Чырвонай Вагранкі»** зьмешчана цікавая заметка рабкора **т. Салавейчыка,** заметка, якая выкрывае агіднае скарыстаньне абсталяваньня. Аказваецца, за 10 месяцаў у такарным цэху было адпрацавана на варштатах 18.214 зьмен, а пры трохзьменнай рабоце на тых-жа варштатах за той-жа час можна было-б адпрацаваць 30.624 зьмены, г. зн. **больш на 68 з лішнім процантаў.**

Сапраўды, **невычарпальны разэрвы нашай прамысловасьці, вялічэзныя вытворчыя магчымасьці заводу «Пралетары», якія выяўляюцца паступова ініцыятывай і здагадкай рабочага калектыву.**

Перавыкананьне сустрэчнага прамфінпляну, прад'яўленьне ў працэсе работы дадатковага сустрэчнага прамфінпляну—на аснове далейшага выяўленьня вытворчых магчымасьцяй—вось выгоднае поле для сацыялістычнага спаборніцтва на заводзе «Пралетары».

І ня толькі на заводзе «Пралетары».

Горны актыўнасьці не павінны патухаць ні на адну сэкунду

У пралетарцаў могуць павучыцца і ўсе іншыя нашы фабрыкі і заводы. Вопыт «Пралетарыя» гаворыць, што **нельга супакойвацца на першых посьпехах, нельга стабілізаваць** вытворчасьць па аснове выкананьня сустрэчнага прамфінпляну.

У нашу эпоху падобная «стабілізацыя» была-б **«сьмерці падобна». Ініцыятыва і актыўнасьць шырокіх рабочых мас не павінны патухаць ні на адну сэкунду.** Пасьля сустрэчнага прамфінпляну—**дадатковы сустрэчны.**

Вытворчыя магчымасьці прадпрыемстваў скарыстаць поўнасьцю.

Фабрыкі і заводы, бярэце прыклад з пралетарцаў!

ПРАЎДЗІН.

Рабочы ленінградзкага заводу па д'емных прылад тав. Георгіеў, улічаючы патрэбу ў кваліфікаваным рабочай сіле, напісаў у ячэйку УсеКП(б) і ў заўком заяву: «Я, стары рабочы, прапрацаваў на вытворчасьці калі 40 год. Бяру на сябе ў другі раз абавязак навучыць кадр сьпецаароў з чорнарабочых, прыстасаваўшы выпуск іх да 13 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі».

НА ЗДЫМКУ—тав. Георгіеў (у акулярах) навучае маладога рабочага

БАРАЦЬБА ЗА ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЮ

На бяспрытульным становішчы

Хуткае разьвіцьцё чырвонабеларускай пароды яшчэ не забясьпечана

Чырвоная беларуская жывёла выгадна адрозьніваецца прыстасаванасьцю да мясцовых умоў, добрай прадукцыйнасьцю і здароўем. На ўсебеларускай выстаўцы экспанаты чырвонай беларускай жывёлы робяць адпаведнае ўражаньне. У параўнаньні з іншымі замежнымі пародамі (галяндка, ангельская) яны даюць ня меншую прадукцыйнасьць, а збоку здароўя, складу цела (так званага экстэр'ера) нават пераважваюць іх.

Гэта група чырвонай беларускай жывёлы згуртавана амаль што выключна ў Самахвалавіцкім раёне, дзе кольласьць галоў гэтай пароды жывёлы перавышае 3.500. Вываз чырвонай беларускай жывёлы з Самахвалавіцкага раёну забаронены. Гэтая парода жывёлы, паводле пастановы ўраду, павінна насыціць увесь Самахвалавіцкі раён, каб з гэтага гнязда потым можна было-б пашыраць палепшаную пароду жывёлы і на іншыя раёны Беларусі.

З гэтага бачым усё вялікае значэньне Самахвалавіцкага раёну — гэтага адзінага раёну ў Беларусі, дзе вядзецца работа над далейшым паляпшэньнем чырвонай беларускай жывёлы.

Наколькі мерапрыемствы, якія праводзяцца па Самахвалавіцкім раёне, адпавядаюць устаноўкам аб спэцыялізацыі жывёлагадоўлі, якія прыняты для гэтага раёну? На гэтае пытаньне дае адказ брыгада камісіі ЦК УсеКП(б), якая зараз абсьледуе беларускую партарганізацыю. Матар'ялы яе абсьледваньня малююць такую карціну.

Самахвалавіцкі раён інтэнсыўнай жывёлагадоўлі адчувае вялікі недахват у натуральных сенажацях. Недахват натуральных сенажацяй дыктуе патрэбнасьць прыняцця мер па паляпшэньні лугоў, і павялічэньні пасеваў траў і кораньплодаў — гэтаму спрыяе багатая сугліністая глеба раёну. Але ні тая, ні другая работа не праводзіцца. Мала таго, — усе плянавыя заданьні, ускладненыя ў гэтым годзе на Самахвалавіцкі раён, апошнім значна зьменшаны. Так, плян па тарфаваньні зьменшаны па 69 проц., радавы пасеў — на 70 проц., зяблевае ўзворваньне на 20 проц. Ваппаваньне глебы зьменшана ў 23 разы—замест 1.161 гэкт. заваппавана 50 гэкт.

Ці выкананы агра і зоамінімум? Справаздачнасьці такой няма, і відавочна, такіх мерапрыемстваў таксама няма. Ільготы па с.-г. падатку за выкананьне агра-зоамінімуму ў гэтым годзе не прадастаўляліся. У паяўнасьці поўная бязьдзейнасьць і парушэньне законаў аб с.-г. падатку.

Нават заданьне па сіласаваньні, якое для Самахвалавіцкага раёну мае вылучнае значэньне, ня выканана. На 10-га верасьня ў калгасах засіласавана 49 тон, або 0,7 проц, усяго заданьня.

У большасьці жывёлагадоўчых калгасаў да будаўніцтва памяшканьняў для жывёлы на зімовы пэрыяд яшчэ ня прыступлена. Адпушчаныя на гэту мэту крэдыты ў значнай частцы не скарыстаны і ляжаць бяз руху ў калгасах і райкаапсаюзе.

Асноўнай работы — барацьбы за якасьць чырвона-беларускай жывёлы ня відаць. Зоатэхнічнай работы ў сэнсе ўліку прадукцыйнасьці жывёлы (вызначэньне процанту тлушчаў, правільнае выхаваньне маладняку) не вядзецца. Замест прадугледжаных плянам 12 тэхнікаў-жывёлаводаў ёсьць толькі 5, ды і яны, замест спэцыяльнай жывёлагадоўчай работы, скарыстоўваюцца для універсальнага абслугоўваньня ўсіх галін сельскае гаспадаркі. Ёсьць пастанова Наркамзему аб арганізацыі ў Самахвалавіцкім раёне дзяржплемкнігі на чырвонай беларускай жывёле, але яна ня выканана. На гэту мэту асыгнаваны грошы, але НКЗ не паклапаціўся адшукаць інспэктара для кіраўніцтва дзяржплемкнігай. Гэта важнейшае мерапрыемства сарвана. Між тым, з-за адсутнасьці дзяржплемкнігі дасягнутыя вынікі па паляпшэньні чырвонай беларускай жывёлы не замацоўваюцца. Уся работа вядзецца ўхаластую.

Яшчэ дагэтуль ня прыступлена да стварэньня спэцыяльных племянных калгасаў з чырвонай беларускай жывёлай, ня гледзячы на дырэктывы. На мясцох ёсьць усе падставы для арганізацыі такіх гаспадарак. Напрыклад, калгас імя Войкава жадае спэцыялізавацца ў якасьці племяной гаспадаркі, але Райкаапсаюз заяўляе: «Ня ведаем, як падыйсьці да гэтай справы, з цэнтру нима ўказаньняў».

З 16 саўгасаў спэцыялізаваны 5—6 гаспадарак. Але і ў гэтых гаспадарках поўнай племянной зоатэхнічнай работы не вядзецца. Запісы ў кнігах вядуцца хаатычна, і па іх цяжка рабіць якія-небудзь заключэньні.

Вывады. У Самахвалавіцкім раёне трэба рашуча перабудаваць усю работу па спэцыялізацыі гаспадарак — племянных і малочна-жывёлагадоўчых. Усе іншыя галіны гаспадаркі трэба прыстасаваць да абслугоўваньня гэтых спэцыялізаваных гаспадарак. Трэба пагыбляць зоатэхнічную работу і яе замацоўваць. Самахвалавіцкі раён, у якім згуртавана амаль уся паяўнасьць чырвонай беларускай жывёлы, патрабуе ўвагі і дапамогі.

Л Н—даў.

Сабраць пай, разгарнуць авансаваньне пад прамтавары і абанэмэнты

Пашырэньне дзейнасьці МЦРК, разьвіцьцё капітальнага будаўніцтва, пабудова сховаў для гароднины, фабрыкі-кухні, арганізацыя ўласнага транспарту, арганізацыя прыгарадных гаспадарак і адкормачных пунктаў—усё гэта патрабуе значных укладаньняў і сродкаў. Узяць гэтыя сродкі ў Дзяржбанку было-б няправільным крокам. Сродкі банку павінны ісьці па фінансаваньне буйной прамысловасьці і сацыялістычнага зямляробства.

Пашырэньне дзейнасьці каапэрацыі, асабліва рабочай, павінна ісьці ў асноўным за лік уласных сродкаў—сродкаў каапэраванага насельніцтва. Між тым, паводле даных, якія ёсьць на 1-га верасьня, Менцэрабкопам сабрана ўсяго 454.000 руб. паявога капіталу, замест вызначаных плянам 660.000 р.—65,4%.

Такое становішча патрабуе самай сур'ёзнай увагі каапэрацыйнага актыву і крамных работнікаў. Неабходна, каб усе ячэйкі і ФЗМК праверылі работу каапэрацыйных камісій у гэтай галіне. Каапэрацыйным камісіям трэба даць жорсткія дырэктывы—да 1-га кастрычніка ліквідаваць усю запазычанасьць па паявых узносах. На работніках крам ляжыць адказнасьць за сваячасовую мабілізацыю сродкаў, як шляхам разгортваньня растлумачальнай работы, так і шляхам ужыцьця рэпрэсыўных мер да пайшчыкаў, якія ня выконваюць сваіх абавязкаў.

Перад каапэрацыйным актывам стаіць яшчэ другая вялікая задача—выканаць дырэктыву ЦК аб мабілізацыі 5 мільёнаў руб., шляхам прыняцьця авансаў пад прамтавары. Цэрабкопам будуць праданы тавары на

ПАРТ'ЯЧЭЙКІ, ФАБЗАЎМЯСЦКОМЫ, ПРАЎЛЕНЬНІ КАЛГАСАЎ!

ВАШ АБАВЯЗАК

зараз-жа арганізаваць шырокую доўгатэрміновую падпіску на

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ „ЗЬВЯЗДОЙ“

„ЗЬВЯЗДУ“

партыйца, беспартыйнага актывістага, рабочага і калгасьніка

Лятуны з мэдпэрсаналу і „паслужлівыя“ райздравы

У гутарцы з нашым супрацоўнікам Народны Камісар Аховы Здароўя тав. **Цэнцыпер** паведаміў наступнае:

У апошні час наглядаюцца заявы сяроднага мэдычнага пэрсаналу, які працуе ў рёнах, аб уходзе з работы на вучастку, у зьвязку з пераездам у горад. Пад рознымі прычынамі імкнуцца дактары пакінуць работу у раёне: тут і сямейнае становішча, доўгая работа на вучастку, немагчымасьць павысіць кваліфікацыю і г. д.

У даны момант, калі ліквідуюцца акругі, калі ўся ўвага зьвернута па ўзмацненьне раёнаў, калі лепшыя спэцыялістыя, партыйныя і беспартыйныя работнікі едуць на работу ў раёны,—такое зьявішча, як масавае імкненьне пакінуць раён, зусім недапушчальна.

Такім імкненьням трэба абвясьціць самую рашучую барацьбу, бо ўсё трэба падпарадкаваць задачам узмацненьня раёнаў.

Заўважаецца, што паасобныя РВК не пярэчаць супроць пакіданьня работы мэдычным пэрсаналам, спадзяючыся, што ім прышлюць дактароў з цэнтру.

Трэба з ўсёй катэгарычнасьцю заявіць, што раёнам няма чаго разьлічваць на прысылку дактароў. У распараджэньні Наркам Аховы Здароўя і Наркамправы няма свабодных мэдыцынскіх работнікаў. Мэдыцынская сетка ў гарадох разьвіваецца, пераход на дыспансэрную сыстэму патрабуе ўсё новых і новых работнікаў.

Зараз наглядаецца яшчэ і такое зьявішча, што раёны пасылаюць хворых у Менск. Тут мае месца вельмі шкодная тэндэнцыя: паколькі ліквідуюцца акругі, акруговыя лекавыя ўстановы адмаўляюцца прымаць хворых з раёну,—«мы абслугоўваем горад, а раёны нас не датычаць».

Лекавыя ўстановы гарадоў павінны ўзмацніць абслугоўваньне бядняцкага і серадняцкага сялянства. Беднякі і сераднякі павінны адчуваць, што з ліквідацыяй акруг абслугоўваньне іх палепшылася.

Прыцёк значнай колькасьці хворых у Менск, якіх можа абслугоўваць акруговая сетка, дэзарганізуе лекавую дапамогу ў Менску і адмоўна адбіваецца на становішчы прыяжджаючых.

Раёны зусім ня ўлічваюць, што цэнтр ні ў якім разе ня можа абслужыць тых тысяч хворых, якія прыяжджаюць з мястэчак і вёсак.

У Менск трэба пасылаць толькі ў самых экстрэнных выпадках. НКАховы Здароўя папярэджвае, што тыя раённыя арганізацыі, якія будуць бяз усякай патрэбы пасылаць у Менск хворых, будуць прыцягвацца да адказнасьці.

Б—ў.

Злачынная безгаспадарчасьць у гаркамітэце ўзаемадапамогі

Выдаўна газэты «Рабочий» і «Акцябр» пісалі аб агідных непарадках і злоўжываньнях у менскім гарадзкім камітэце ўзаемадапамогі.

Фрунзаўскі райком КП(б)Б даручыў свайму прадстаўніку абсьледаваць дзейнасьць камітэту. Быў праведзен рад сходаў рабочых прадпрыемстваў, якія належаць гарадзкому камітэту ўзаемадапамогі, праведзена рэвізія бухгальтэрыі. Выяўлены рад агідных фактаў безгаспадарчасьці, злачынных адносін да матар'ялу, разьбільдзьства і г. д.

Былы старшыня камітэту **Табачнік** і яго намесьнік **Сьвідэрскі** акружылі сябе спрытнымі махлярамі - лішэнцамі, якія рабілі самыя цёмныя справы і эксплёатавалі рабочых прадпрыемстваў камітэту. Тэхнічны кіраўнік фабрыкі люстэрак **Партноў** выпрацоўваў паўфабрыкаты замест гатовай прадукцыі. Гэтыя паўфабрыкаты валяліся па ўсіх кутках фабрыкі, якая пацярпела некалькі тысяч руб. страт.

Бой люстэркавага шкла складаў больш 60%, прадукцыйнасьць працы зьнізілася да 1,5 нармальнай выпрацоўкі, выпрацавана за красавік прадукцыі на 5.185 руб., у той час, калі ведамасьць на зарплату складала 5.994 руб. За адзін месяц фабрыка мела страт ад 7 да 8.000 руб.

На лясным складзе і на фабрыцы скрынак ня было ніякага ўліку выдаткаваньня лесаматар'ялу і цьвікоў. Дэфіцытныя лесаматар'ялы прадаваліся розным прыватным асобам, а фабрыка заставалася бяз сырцу. Кампанія, якая кіравала лясным складам—Бацьвіньнік і Леванда—бяз усякага дазволу гандлявалі лесаматар'ялам.

Злачынна вёў бухгальтэрыю галоўбух Гінэбург, які праводзіў няўгрунтаваныя дакументы махляроў — Бацьвіньніка, Гершопа, Файна, якія знайшлі сябе цёплае месца ў камітэце.

На прадпрыемствах камітэту—люстэркавай фабрыцы сьлясарна-мэханічнай майстэрні панавалі п'янні, разгул, антысэмітызм і шавінізм. Зьдзекваліся з яўрэйскіх рабочых, імкнуліся выгнаць іх з прадпрыемства.

Сьлясарна-мэханічная майстэрня выдаткавала дэфіцытныя матар'ялы бяз усякага ўліку. Замест абслугоўваньня прадпрыемстваў камітэту, яна займалася выкананьнем прыватных заказаў—адліўкай з бронзы і медзі для розных асоб.

Загадчык майстэрні Сьвідэрскі прадаў гатэрны варштат, які зараз вельмі патрэбны прадпрыемствам камітэту. Енжа прадаў добры такарны варштат за паўцаны, ведаючы, што камітэт пашырае майстэрні, і варштат будзе патрэбны.

Зараз гэтай справай займаюцца судовыя органы.

Непакорны.

Ад'езд у водпуск тав. Ульлянава А. Т.

Упаўнаважаны НКЗамежных Спраў СССР пры Ўрадзе БССР тав. Ульлянаў А. Т. 16 верасьня выехаў у паўтарамесячны адпачынак для лячэньня. Кіраўніцтва Управай Упаўнаважанага НКЗС на час яго водпуску ўскладзена на сакратара ўправы тав. Густыра Я. Т.

ТРАМВАЙ МОЖНА СКАРЫСТАЦЬ ДЛЯ ПЕРАВОЗКІ ГРУЗАЎ

Гарсавету трэба паклапаціцца аб пляцформах

Ва ўчарашнім нумары нашай газэты т. Кейлін высунуў пытаньне аб скарыстаньні трамваю для разгрузкі менскага чыгуначнага вузла і перавозкі грузаў. Наш супрацоўнік зьвярнуўся да галоўнага інжынэра трамвайнага кіраўніцтва т. Максіменка з просьбай выказаць сваю думку наконт прапановы т. Кейліна.

— Ідэя скарыстаньня трамваю для перавозкі грузаў,—сказаў т. Максіменка,—ня новая. Яшчэ ў 1929 годзе, пры будаўніцтве трамваю, быў узьняты праект скарыстаньня яго для перавозкі грузаў. Адначасова былі даны заказы Мцішчанскаму вагоннаму заводу на выраб патрэбных 10 пляцформ, але завод ад заказу адмовіўся.

Скарыстаць коначныя вагоны і восі для пабудовы пляцформ немагчыма, бо разьмеры іх не адпавядаюць разьмерам трамвайных ліній. Злучэньне-ж трамвайных ліній з таварнымі станцыямі вельмі нескладная работа, якая можа быць зараз-жа выканана.

Усё пытаньне ўпіраецца выключна ў набыцьцё пляцформ. Неабходна, каб гарсавет узьняў хадайніцтва перад ВСНГ аб тым, каб заводы ў тэрміновым парадку выканалі заказ на вагонныя пляцформы.

Тав. Максіменка цалкам падтрымлівае думку т. Кейліна і лічыць, што вакол гэтага пытаньня павінна быць мабілізавана грамадзкая думка для хутчэйшага ажыцьцяўленьня праекту.

Усебеларускі зьезд ахматмладу

НК аховы здароўя склікае ў Менску, у кастрычніку Усебеларускі зьезд работнікаў Ахматмладу.

У рабоце зьезду прымуць удзел прадстаўнікі калгасаў, бытавых камісій РВК і буйнейшых фабрык БССР, дзе ўжываецца жаночая праца.

Суд

ЗА ЎТОЙВАНЬНЕ РАЗЬМЕННАЙ МАНЭТЫ

У ліпені і жніўні месяцы г. г. калі ў горадзе **Менску** адчуваліся некаторыя затрудненьні з дробна-разьменнай манэтай, калі касы крамы № 25 МЦРК (Менск) можна было заўважыць вялікія чаргі спажыўцоў, якія чакалі рэшты. Нават у той час, калі разьменная манэта была ў касе, касірша **Сулкоўская Н.** адмаўлялася даць рэшту.

Гэта прымусіла загадчыка крамы № 25 зьвярнуцца да сьледчых органаў.

4-га жніўня г. г. сьледчыя органы зрабілі вобыск у кватэры **Сулкоўскай**, дзе было знойдзена 32 руб. 85 кап. дробнай манэты.

Далейшае сьледзтва выявіла, што **Сулкоўская** вельмі часта абменьвала крэдытныя білеты на разьменную манэту, якую яна трымала ў сябе на кватэры і скарыстоўвала для сваіх мэт. Гэтым самым **Сулкоўская** наглыбляла затрудненьні з разьменнай манэтай.

15-га верасьня г. г. нарсуд 1-га вучастку (Менск), разглядаючы гэту справу, дошчэтам раду сьледак устаноўлена віноўнасьць **Сулкоўскай**.

Выходзячы з гэтага, нарсуд 1-га вучастку прыгаварыў Сулкоўскую да пазбаўленьня волі на 2 гады.

Усебеларуская выстаўка

Больш увагі адбору экскурсантаў

Трэба адзначыць няўважлівыя адносіны раённых выставачных камітэтаў да адбору экскурсантаў на Ўсебеларускую выстаўку. За час з 10-га жніўня праз выстаўку прайшло 60 проц. служачых і толькі 40 проц. рабочых і калгасьнікаў.

Наглядаецца, што прыяжджаючыя настаўнікі і студэнты, замест дэталёвага азнаямленьня з выстаўкай, скарыстоўваюць тры дні знаходжаньня ў горадзе на агляд Менску і наведваньне знаёмых.

Групаводы-настаўнікі, якія прыяжджаюць з вучнямі-экскурсантамі, пакідалі іх адных на выстаўцы, а самі ўходзілі па асабістых справах у горад. Такое-ж зьявішча наглядаецца, калі прыяжджаюць сяляне экскурсанты з настаўнікамі-групаводамі.

Трэба больш увагі аддаць падбору экскурсантаў, бо выстаўка не зьяўляецца нейкай забавай, а практычнай школай, якая навучае сялян, як трэба будаваць сацыялістычную гаспадарку, якая палітычна выхоўвае працоўныя масы.

10 подпісаў групаводаў.

Не інтэрнат, а хлеў

На пабудове клінік адведзены барак пад інтэрнат для экскурсантаў Усебеларускай выстаўкі. Парадкі ў інтэрнаце агідныя. Заўсёды брудна, навалакі на падушках не зьмяняліся з часу адкрыцьця выстаўкі, простынь няма, холадна, дах—працякае, і ў дажджлівыя дні сяньвікі заўсёды мокрыя.

Экскурсанты, прыяжджаючы, заўсёды лаюць групаводаў, якія абслугоўваюць інтэрнат, бо групаводы зьяўляюцца адзінымі «поўпрэдамі» выстаўкі ў інтэрнаце.

Групаводы некалькі раз зварачаліся ў экскурсыйнае бюро, але ім адказвалі, што дапамагчы ня могуць.

Гэтымі днямі, увечары, у інтэрнат прыбыла група экскурсантаў у 80 чал. з Барысава. Яны наглядзелі на парадкі, абаялі па традыцыі групаводаў, а на заўтра раніцай разьбегліся.

Загадчык экскурсбюро т. Раманчук на заяву аб парадках у інтэрнаце адказаў: «Я вам нічым дапамагчы не магу; я ня бываю ў інтэрнатах, знаём з імі толькі на паперы».

Гайнэр і Бельская.

Справачнік МЦРК

— Усе талёны, выданыя МЦРК на абутак і гатовае адзеньне тэрмінам да 1, 15 і 20 верасьня, а таксама талёны, выданыя на абутак да 20-25 ліпеня, сапраўдны да 25 верасьня.

***

МЦРК устанавіў тэрмін прыёму заявак ад установаў на дровы да 25 верасьня.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— **Дом Камасьветы.** Сёньня, а 7 гадз. увеч — групавая канэультацыя для парт. і камсам. актыву па літаратуры (пак. № 19).

У **Доме Камасьветы**, пак. № 21, даяжураць кансультанты на пытаньнях: мэтодыкі прапаганды, бягучай палітыкі і XVI партэзьезду штодзённа з 11—2 гадз. і 5—9 гадз. увеч.

— **Культпроп ЦК КП(б)Б** даводзіць да ведама, што Беларускай арганізацыі на 1930 г. прадастаўлена 4 месцы ў Ленінградзкі палітасьветны інстытут. Умовы прыёму апублікаваны ў газэце «Правда» ад 15 верасьня 30 г. № 224. Заявы трэба падаваць у культпроп ЦК не пазьней 19 верасьня.

— **Культпроп ЦК КП(б)Б** даводзіць да ведама, што ёсьць 6 месц на латсэктар Ленінградзкай абласной саўпартшколы. Заявы трэба падаваць у культпроп ЦК не пазьней 19 верасьня.

— **Пэдгабінэт.** Сёньня, а 19 гадз., у памяшк. 11 школы (Камсамольская, 23) — сход настаўнікаў 1-х груп, якія працуюць з няшасьленнымі.

Сёньня, а 17 гадз., дэманстрацыя вучняў прафшкол і сямігодак. Месца збору для Кастрычніцкага раёну — сквер па Сьвярдлоўскай, для Фрунзаўскага—пляц Волі. Пры дрэнным надвор'і, дэманстрацыя пераносіцца на 18 верасьня а 5 гадз.

Сёньня, а 19 гадз., у 2-й школе — сход настаўнікаў 2-х груп.

— **Усім установам 7 групкому працасьветы.** Сёньня, а 7 гадз. увеч., у Доме Асьветы адбудзецца агульны сход 7 групкому. Яўка абавязкова.

— **БДУ.** Усе студэнты факультэту Наргасу, якія засталіся ў г. Менску, павінны на пардпаў 17, 18 і 19 верасьня ад 6—7 гадз. увеч. зьявіцца ў прафком.

— Усе гарадзкія і раённыя саветы ваяўнічых бязбожнікаў павінны да 1 кастрычніка вылучыць, згодна данай разьвёрсткі, слухачоў для антырэлігійнага аддзяленьня палітыка-асьветнага факультэту па радыё. Вылучаныя т.т. павінны да 1 кастрычніка падаць заяву па адрасе: Менск, Унівэрсытэцкая, 16, Беларускі радыё-цэнтр, Беларускаму Рабоча-Сялянскаму унівэрсытэту па радыё, антырэлігійнае аддзяленьне. Сьпіс вылучаных т.т. прыслаць да 1 кастрычніка ў цэнтральны савет ваяўнічых бязбожнікаў БССР.

Выканбюро ЦС СВБ БССР.

— **Да ведама навуковых працаўнікоў.** ЦВ секцыі навуковых працаўнікоў прапануе членам секцыі, утрыманцы якіх ня былі прынаты ў ВНУ БССР, зарэгістравацца ў секцыі да 20 верасьня з 2 да 4 гадз. дня ў т. Юдовіча.

— Бюро парт'ячэйкі навуковых і тэхнічных працаўнікоў БДУ паведамляе, што 17 верасьня г.г., а 4 гадз. увечары, у памяшканьні агульнай кацыляры БДУ адбудзецца адчытны агульны сход парт'ячэйкі.

Парадак дня: 1. Прапрацоўка адозвы УсеКП(б) (т. Каракеўскі); 2. Выбары дэлегатаў на раённую партканфэрэнцыю; 3. Бягучыя справы. Яўка ўсіх членаў абавязкова. Таксама запрашаюцца беспартыйныя працаўнікі.

— **Дом Асьветы.** Сёньня а 8-й гадз. увечары адбудзецца агульны сход камсамольскай ячэйкі Працасьветы. Яўка камсамольцаў абавязкова.

Час. вык. абав. адказ. рэдактара А. МІТЛІН.

КАСТРЫЧНІЦКІ РК КП(б)Б

склікае 17 верасьня, а 6 гадз. увеч. у памяшк. РК (пакой культпропу)

ПА-ЗАЧАРГОВЫ ПЛЕНУМ РК

У ПАРАДКУ ДНЯ:

1. Пытаньні канферэнцыі. 2. Вынікі абсьледаваньня парткалектыву МЦРК. 3. Розное.

Просьба да членаў і кандыдатаў РК, роўкамісіі з парттройкі і сакратароў ячэек КП(б)Б зьявіцца без спазьненьня.

КАСТРЫЧНІЦКІ РК КП(б)Б

18 верасьня, а 6 гадз. увеч. у памяшк. клюбу мэталістых (Унівэрсытэцкая, 12),

склікае

ПА-ЗАЧАРГОВУЮ РАЙПАРТКАНФЭРЭНЦЫЮ

з парадкам дня:

1. Вынікі выкананьня прамфінпляну за 29-30 г. і задачы выкананьня прамфінпляну ў 30-31 г. (сустрэчны прамфінплян і г. д.). 2. Аб падрыхтоўцы транспарту да асеньня-зімовых перавозак. 3. Выбары РКК.

Сьпісы дэлегатаў павінны быць прадстаўлены ў РК не пазьней 17 верасьня. Мандаты атрымаць у РК з 9 да 3 гадз. дня.

Камісія ЦК УсеКП(б) па праверцы працы праф. арганізацый Беларусі

СКЛІКАЕ НАРАДУ

старшынь ФЗМК і старшынь вытворчых нарад

на 17 верасьня 1930 г. а 6-й гадзіне ўвечары ў залі пасяджэньняў ЦСПСБ па пытаньні перабудовы працы прафсаюзаў (тварам да вытворчасьці).

На нараду запрашаюцца:

«Энергія», «Камунар», Эльвод, «Бальшавік», Абутковая ф-ка, Шчотачная ф-ка, «Дзеваапрацоўшчык», «Беларуска», друкарня імя Сталіна, «Чырвоны Тэкстыльшчык», Гута «Пралетары», Ф-ка «Кастрычнік», Ф-ка імя «1-га мая», Унівэрсытэцкі гарадок, Дом Ураду, «Чырвоная Зорка», Адда, хлебазавод, Трамвайнае дэпо, 1-ы групком МЦРК, Наркамфін, МК сталовак, БДУ, МК 2-й сав. б-цы, Станцыёны камітэт.

Назначаецца на 17 верасьня ў памяшканьні. Фрунзаўскага РК КП(б)Б а 6 гадз. веч. **ПАСЯДЖЭНЬНЕ БЮРО РК** з удзелам усіх сакратароў партыйна-савецкіх ячэек, партыйдаў старшынь мясцкомаў, кіраўнікоў устаноў і эканомсэктараў

пераносіцца на 20 верасьня

Парадак дня: 1. Праверка правядзеньня ў жыцьцё адозвы ЦК УсеКП(б) па савецкіх установах (інфармацыі трыкутнікаў ВСНГБ і Наркамзему і садклад камісіі па абсьледаваньні. Яўка членаў і кандыдатаў бюро і ўсіх вышэйпералічаных асоб абавязкова.

Мастацкі ЦЫРК | Пад кіраўніцтвам І. Л. СТРАШЭВІЧА

Серада, 17, і чацьвер, 18 верасьня.

ВЯЛІКІЯ ПРАДСТАЎЛЕНЬНІ

ПЕРШАЯ ГАСТРОЛЬ

рэкордных турнікістых на 5-ці турніках

5 сальтэнс 5

АПОШНІЯ ДНІ ГАСТРОЛЯЙ. Выкрышьцё сыстэмы чалавек-рахуноковая машына **Аляксандра Хэйфеца**, музычных сатырыкаў **Біб-Боб**. Увесь новы рэпэртуар.

Працяг гастроляй Чалавек-фантан! Чалавек-агнягасцель! **Гатамо**

Арыстка бляску **Майсеева і Поль** Акрабатычныя танцы | Японскі артыст **Ооадо** эквілібрыстыя.

Пачатак а 8 г. 30 м.

Адказны кіраўнік І. Л. СТРАШЭВІЧ.

Кіно-тэатр **„Культура“**

Мастацкі фільм

Цьвёрды характар

сучасная драма ў 6 частках.

Зьвыш праграмы: **БАЙКА СТРАТАМ** культурфільм у 1 частцы.

1-шы **ўсебелар. аўта-вэлё-прабег.** кіно-нарыс вытворчасьці Белдзяржкіно.

Пачатак сэансаў: а 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м. Каса адкрыта ад 5 гадз.

КІНО **Інтэрнацыянал**

Нямецкі фільм

НЯВЕСТА БОКСЭРА

Штодзённа 4 сэансы

Пачатак: а 6 г., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м.

Каса—з 5 гадз. увеч.

КІНО **„Пралетары“**

Нямецкі фільм

ДЗЕЛЯ ДЗІЦЯЦІ

(КРЫВАПРЫСЯГА)

Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз.

Каса—з 5 гадз.

ДЗІЦЯЧЫ кіно-тэатр **„ЮНЫ ПІЯНЭР“**

2 новыя фільмы 2

1) **ЗАУТРА НОЧЧУ** (пабег 10 сьмертнікаў з варшаўскай турмы)

2) **ЖАРТЫ МАРОЗА**

камэдыя ў 1 частцы

КОЖНЫ ДЗЕНЬ 2 СЭАНСЫ.

Пачатак 1-га сэансу а 2 г. дня.

Каса адкрыта ад 12 гадз.

Кіно **„СПАРТАК“**

Выдатны мастацкі фільм

ЗАРЭ

драма ў 7 частках.

У ГАЛ. РОЛІ **МАРЫЯ ГЭНАЗІ.**

Пачатак сэансаў: 1—7 г., 2—9 г., 3—10 г. 30 м.

Каса—ад 6 гадз.

Беларускаму хэміка-тэхналёгічнаму інстытуту

ПАТРАБУЮЦЦА на сталую працу

два лябаранты-хэмікі

Паведамл—Землярабскі зав., 4, навучальная частка інстытуту.

На днях в кино „Культура“

ДОМ СЕЛЯНІНА, 3-ці ПАВЕРХ,

УСЕБЕЛАРУСКАЯ МАСТАЦКАЯ ВЫСТАЎКА

нарцін, графікі, скульптуры ар хітэктуры.

Уваход для арганізаваных экскурсій і для паведвальнікаў сельска-гаспадарчай выстаўкі і дзяржаўнага музэю—**вольны.**

Выстаўка адкрыта ад 10-4 гадз. увеч., а 5-га, 10-га, 15-га, 20-га, 25-га і 30-га ад 10 гадз. раніцы да 10 увеч.

ВЫСТАЎКОМ.

Жыткавіцкі Рыбаводны Тэхнікум

(б. Мазырск. акр.) абвяшчае, што прыём заяў у тэхнікум

ПРАДОЎЖАНЫ ДА 1-га КАСТРЫЧНІКА

Тэхнікум складаецца з наступных аддзяленьняў: **рыбаводнага і гідратэхнічнага.**

Заняткі па абодвых аддзяленьнях пачнуцца з 15 кастрычніка. Слухачы будуць забясьпечаны стыпэндыяй. Заявы накіроўваць па адрасе: ст. Жыткавічы, БССР, прыймовай камісіі рыбаводнага тэхнікуму.

ЗАВОЧНЫЯ БУХГАЛЬТАРСКІЯ КУРСЫ

Прыём слухачоў праводзіцца круглы год.

Прымаюцца асобы з 17-гадовым узростам з асьветай ня ніжэй 5 гр. 7-годкі.

ПЛАТА ЗА УРС 33 руб.

правозіцца так: 9 руб. пры паступленьні на курсы, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8-ы месяц і па 4 руб. на працягу 6 месяцаў у пачатку кожнага навучальнага месяца.

Заявы, запытаньні і грошы накіроўваць па адрасе: **Менск, пошта, скрынка 44, Завочным курсам.**

На адказ прыкладаць 2 маркі па 10 кап.

УСЕ ДАВЕДКІ

па любым пытаньні

ДАЕ БЮРО АБСЛУГОЎВАНЬНЯ

БЕЛАРУСКАГА КІРАЎНІЦТВА СУВЯЗІ

Даведкі можна атрымаць вусна, пісьмова, па тэлефону і тэлеграфна

ДЛЯ АТРЫМАНЬНЯ ДАВЕДАК ПА ТЭЛЕФОНУ

неабходна стаць абанэнтам бюро даведак.

Па пытаньні абаняваньня званеце па **тэл. 12-47.**

Бюро працуе з 9 да 20 гадз. Менск, Ленінская, 34, будынак пошты.

БЮРО АБСЛУГОЎВАНЬНЯ прымае заказы на **ГАЗЭТНЫЯ ВЫРАЗКІ**

з усіх газэт і часопісяй СССР і замежнага друку.

Выразкі высылаюцца па ўсіх бяз выключэньня пытаньнях.

Самую лепшую і правільную інфармацыю па пытаньнях, якія вас цікавяць, вы атрымаеце праз бюро газэтных выразак.

Падпісвайцеся на газэтныя выразкі!

Для прыёму заказаў званеце па **тэл. 12-47.**

Кіраўніцтва ашчадкасамі БССР

паведамляе, што

ПРОДАЖ ВЗЛЁАБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ III і IV сэрый

ПРАЦЯГНУТЫ да 15 кастрычніка г. г.

ТЭРМІН III сэрыі—1 красавіка 1932 г.

„ IV „ —1 жніўня 1932 г.

Умовы падпіскі апублікаваны ў газ. „Зьвязда“ № 98 ад 27-IV—30 г.

Кіраўніцтва ашчадкасамі БССР.

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА ШОСАВЫХ І ГРУНТАВЫХ ДАРОГ І АЎТАТРАНСПАРТУ БССР

абвяшчае прыём заяў

у Гомельскі дарожна-будаўнічы тэхнікум

(рэарганізаваны III канцэнтр чыгуначнай школы).

Прыём на асульных падставах, згодна даведніка НКАсьветы.

Частка студэнтаў забясьпечаецца стыпэндыяй і інтэрнатам.

Заявы прымаюцца **да 20 верасьня** канцылярыяй тэхнікуму ў **г. ГОМЕЛІ, пасёлак „Чырвоны Кастрычнік“, будынак чыгуначнай школы.**

ГАЛОЎДАРТРАНС БССР.

Для здачы **АБВЕСТКІ** у газэту **„ЗЬВЯЗДА“** званеце па тэл. **7-81**

ЗАНЯТКІ

на 2, 3 і 4 курсах мэлфаку Беларускай Дзяржаўнай с.-г. акадэміі

ПАЧНУЦЦА з 1-га ЛІСТАПАДА,

да якога тэрміну ўсе студэнты адзначаных курсаў павінны зьявіцца ў акадэмію.

УВАГА: Студэнты **IV курсу тарфянога аддзяленьня павінны зьявіцца ў акадэмію 25-га верасьня.**

Дырэктар акадэміі ПІНЧУК.

Галоўдартрансам адкрываюцца курсы „Дорстройуча“

з кваліфікацыяй цесьляроў і аўтаманцёраў.

У школу прымаюцца вучні абодвага роду—дзеці рабочых, батракоў, калгасьнікаў, беднякоў, сераднякоў, служачых і саматужнікаў, якія знаходзяцца ў арцелях, з адукацыяй 5—7 клясаў 7-годкі для аўтаманцёраў і 4 клясы для цесьляроў, ва ўзросьце ад 15 да 19 год.

Прыём заяў пачнецца **да 25 верасьня** ў г. Бабруйску, Пушкінская № 52, дом б. акдараддзелу.

Школа аўтаманцёраў адкрываецца ў Бабруйску, а школа цесьляроў у г. Рагачове.

Тэрмін навучаньня для цесьляроў 1 з пал. г., аўтаманцёраў—2 гады. Да заявы прыкладаюцца дакументы: аб сацыяльным становішчы, адукацыі, аб узросьце, фізычным стане і аб праве голасу. Скончыўшыя гэтыя курсы скарыстоўваюцца на працах Галоўдартрансу па гэтай кваліфікацыі. Курсанты атрымоўваюць стыпэндыю і інтэрнат.

Адміністрацыя.

19-га верасьня, роўна з 12-й гадзіне, у памяшканьні Цэнтрархіва (вул. Энгельса, 26, 3-ці паверх, пакой 22)

адбудзецца

пасяджэньне Савету Цэнтральнага Архіўнага Кіраўніцтва БССР

З АБВЕСТКАЙ ДНЯ:

1. Разгляд праекту палажэньня аб Цэнтральным Архіўным Кіраўніцтве і яго органах (у зьвязку з ліквідацыяй акруг).
2. Вытворчы плян на 1930-31 апэрацыйны год.
3. Аб ахове ад зьнішчэньня навукова-гістарычных архіўных матар'ялаў.
4. Бягучыя справы.

На пасяджэньне Савету запрашаюцца наступныя члены: Сэрбэнта В. А., Раманчук Я. А., Даўгяла З. І., Левін Л. Р., Руманаў А. Ф., Казак А. З., Макуня М. М., Мікуліч А. П., Мачульскі Т. Б., Ульлянаў А. Т., Вашчыла-Вірын М. Г., Акаловіч Б. В., Кабалін В. А., Шастакоў П. П., Дзіхняр С. Р., Каранеўскі Я. П., Будзін Ш. А., Вашкевіч П. Е., (Віцебск), Ярмаловіч Я. У. (Магілеў), Андронаў Я. О. (Гомель).

Яўка абавязкова.

Загадчык Цэнтральнага Архіўнага Кіраўніцтва БССР А. ІОДКА.

Згубленыя і украдзеныя дакументы

лічыць несапраўднымі:

Вуч.-конск. карт. Дубкова М. І., выд. Чавуск. РВК. 1000
Вуч.-конск. карт. Шпартава П., выд. Чавуск. РВК. 1001
Вуч.-конск. кн. Мінькова А., выд. Расонск. РВК. 1002
Вуч.-конск. карт. Лужкоўскага З., выд. Расонск. РВК. 1003
Пашп. № 9527, выд. Новадворск. с.-с., праф. кн. № 1138 Вайсака Я. 1004
Вуч.-конск кн. № 6709 Жарносека І. Я., выд. Лепельск. РВК. 1005
Паявая кн. Магілеўца Ю., выд. Урэцк. спаж. т-вам. 1006
Вуч.-конск. кн. Паграбіцкага І. С. 1007
Вуч.-конск. карт. Кулінковіча І., выд. Смалявіцк. РВК. 1008
Пасьведч. аб сканч. Капыльск. прац. шк. II ступ. Красуцкай А. З. 1009
Паявая кн. № 3781 Лапценка А. С., выд. Бярэзін. спаж. т-вам. 1010
Каап. кн. № 879 Самуйлава А. 1011
Паявая кн. № 36 Лычнікава М., выд. Клясьціцк. спаж. т-вам. 1012
Камсам. біл. № 31650 Мураўёва М. П., выд. Аршанск. АК ЛКСМВ. 1013
Вуч.-конск. карт. № 598 Нікалаенка К. 1014
Паявая кн. № 1164 Максіменка П. К., выд. Нараўлян. спаж. т-вам. 1015
Паявая кн. № 1330 Дзюка П., выд. Бярэзін. спаж. т-вам. 1016
Беспрац. кн. Іванова Ф. Н., выд. Чавуск. страхкасай. 1017
Вуч.-конск. карт. Цыганкова Е. В., выд. Чавуск. РВК. 1018
Чл. біл. саюзу СГЛР № 71800 Дуброва Г. М. 1019
Пасьведч. № 429-а Славіна А., выд. Лепельск. міліцыяй. 1020
Вайск. кн. і вуч.-конск. карт. Савіна М. Г., выд. Барыс. ваенкаматам. 1021
Праф. біл. № 43216 Голуб Ф. Х. 1022
Вуч.-конск. карт., выд. на імя Нараўлян. л-ва. 1023
Паявая кн. № 1660 Глушакевіча Я. 1024
Чл. біл. саюзу будаўнікоў № 6/2487 Дарохіна Г. Т. 1025
Паявая кн. Савіцкай Е., выд. Клясьціцк. спаж. т-вам. 1026
Парт біл. № 108444. выд. Гом. АК КП(б)Б, праф. біл. Фельдмана Л. А. 1027
Паявая кн. № 1294 Жукоўскага Ф., выд. Камена-Борск. спаж. т-вам. 1028
Каап. кн. № 5462 Лобач Л. З., выд. Койдан. спаж. т-вам. 1029
Паявая кн. № 4414 Васюковіч М. М., выд. Бягомльск. спаж. т-вам. 1030
Пасьведч. № 474 Лікіча М. К., выд. Бягомльск. РВК. 1031
Вуч.-конск. карт. Брэчна У., выд. Сьмілавіцк. РВК. 1032
Вуч.-конск. карт. № 595 Няміра А. А., выд. Лепельск. РВК. 1033
Чл. каап. кн. Асіпчыка І., выд. Узьлянск. спаж. т-вам. 1034
Паявая кн. Парфяновіча П. І., выд. Вітуніцк. спаж. т-вам. 1035

Друкарня газ. «Зьвязда», Менск. Менск. Галоўлітбел 337.